Першыя выпускнікі ліцэя МУС

СТАР. 5

Чым небяспечны стрэс

СТАР. 9

Савецкі Мядзведзь

СТАР. 11

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

29 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. СЕРАДА № 122 (28232) Кошт 2400 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Парламенцкі дзённік

ЗАКОНАПРАЕКТЫ САЦЫЯЛЬНАЙ НАКІРАВАНАСЦІ

Учора на дзявятай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу абмяркоўваўся шэраг пытанняў, звязаных з праектамі законаў аб нарматыўна-прававых актах, удасканаленні ў галіне ветэрынарнай дзейнасці і жывёлагадоўлі, аб сацыяльнай абароне сірот, аб пытаннях вымушанай міграцыі, барацьбы з карупцыяй, аб удасканаленні сістэмы органаў пракуратуры, а таксама па пытаннях супрацьдзеяння незаконнаму абароту наркатычных і псіхатропных сродкаў.

Як адзначыла **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Тамара КРАСОЎСКАЯ**, законапраект «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон «Аб гарантыях па сацыяльнай абароне дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, а таксама асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў» з'яўляецца значным і вельмі важным для рэгулявання тых правадносін, якія складваюцца ў гэтай катэгорыі грамадзян. Дзякуючы новым дапаўненням Закон будзе рэгуляваць жыллёвыя пытанні, якія звязаныя з правам прадастаўлення такім грамадзянам сацыяльнага жылля. У Законе будзе сфармулявана палажэнне, згодна з якім гэтых грамадзян, што прыбываюць на сваё першае працоўнае месца, забяспечаць сацыяльным жыллём да будаўніцтва свайго ўласнага жылля. Яно прадастаўляецца на пяць гадоў і пасля гэтага тэрміну, пры неабходнасці пераходзіць у статус арэнднага. Такім чынам, гэтая катэгорыя грамадзян ураўноўваецца ў сферы жыллёва-прававых адносін з усімі астатнімі членамі грамадства.

Таксама ў ранейшай рэдакцыі Закона дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, а таксама асобы з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў атрымлівалі матэрыяльную падтрымку ад дзяржавы ў выглядзе абутку, адзення, некаторых бытавых прыладаў і грашовай дапамогі для іх лепшай сацыялізацыі да 23 гадоў. Згодна з новай рэдакцыяй прынята рашэнне, у якім па дасягненні 23 гадоў названая катэгорыя грамадзян будзе працягваць карыстацца ўсталяванымі льготамі пры ўмове атрымання адукацыі на дзённай форме навучання.

Згодна з законапраектам «Аб нарматыўна-прававых актах Рэспублікі Беларусь» нарматыўныя прававыя акты ў краіне плануецца ацэньваць з пазіцыі ўздзеяння на прыватны бізнес.

Асобным элементам прагназавання наступстваў прыняцця (выдання) нарматыўнага прававога акта, згодна з законапраектам, стане ацэнка, якая рэгулюе ўздзеянне на ўмовы для вядзення прадпрымальніцкай дзейнасці. Праекты дакументаў будуць правярацца з мэтай выяўлення палажэнняў, якія ўсталёваюць залішнія абавязкі, забароны і абмежаванні, неабгрунтаваныя выдаткі для суб'ектаў прадпрымальніцтва.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *kryzhevich@zviazda.by*

ГАЛОЎНЫЯ АДЗНАКІ ПАСТАВІЦЬ ЖЫЦЦЁ

Фота БЕЛТА.

Учора ў сталіцы адбыўся Рэспубліканскі баль выпускнікоў вышэйшых навучальных установаў Беларусі. У святе прынялі ўдзел 222 выпускнікі з 52-х ВНУ краіны. Сярод запрошаных — лепшыя выпускнікі ўніверсітэтаў, пераможцы алімпіяд і конкурсаў, лаўрэаты спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Стала добрай традыцыяй, што на святе прысутнічае кіраўнік дзяржавы. Выступаючы перад прысутнымі, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Я бачу гатоўнасць маладога пакалення плённа працаваць і праяўляць ініцыятыву. І я гэта вітаю. Паколькі вам трэба асвойваць новыя тэхналогіі, развіваць вытворчасць, сферу паслуг, выводзіць беларускую культуру і навуку на лідзіруючыя пазіцыі ў свеце».

Прэзідэнт звярнуў увагу на сімвалічнасць таго, што выпускнікі пачынаюць сваю дзейнасць у якасці спецыялістаў у першы год новай пяцігодкі, на якую краіна ўскладае вялікія надзеі ў плане дынамічнага развіцця, і падкрэсліў, што дзяржава робіць стаўку на моладзь. «Таму і ў нядаўна прынятай праграме (сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады. — **Заўвага БЕЛТА**) адным з дзяржаўных прыярытэтаў з'яўляецца палітыка ў адносінах да моладзі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, лёс моладзі неабыякавы дзяржаве, і яна робіць усё, што павінна, у прыватнасці прадастаўляе першае рабочае месца па спецыяльнасці. «Не кожная дзяржава сабе гэта можа дазволіць. Ды і ў нас ішлі вельмі сур'ёзныя дэбаты апошнім часам, як быць у гэтым плане, з-за таго што мы трапілі ў паласу сур'ёзнай турбулентнасці ў эканоміцы, — расказаў Прэзідэнт. — Прапаноўвалі адмовіцца: няхай моладзь, якая скончыла ВНУ, сама вызначаецца ў жыцці. Я катэгарычна супраць гэтага. Мы захавалі для ўсіх вас магчымасць працаўладкавацца, пайсці на работу, але астатняе — за вамі».

Прэзідэнт дадаў, што ў выпускнікоў настае новы, вельмі адказны этап прафесійнага станаўлення. Ён стане своеасаблівай праверкай таго, чаму яны навучыліся і як будуць выкарыстоўваць свае веды ў паўсядзённай практыцы. «Ужо не выкладчыцкія ацэнкі ў заліках будуць вызначаць ваш аўтарытэт, а рэальныя справы, працоўныя дасягненні на канкрэтных участках самастойнай работы», — звярнуў увагу беларускі лідар.

■ Выбары-2016

Кандыдаты ў дэпутаты змогуць купіць эфірны час,

а прэтэндэнтаў без даходаў абавяжуць указаць крыніцу сродкаў існавання

Кандыдатам у дэпутаты створаны не горшыя ўмовы, чым на прэзідэнцкіх выбарах, заверыла Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Беларусі на ўчарашнім пасяджэнні ЦВК.

5 эфірных хвілін у рэйтынгавы час

Бясплатна размясціць свае перадвыбарныя праграмы кандыдаты змогуць у рэспубліканскіх выданнях: «Звязда», «Народная газета», «Рэспубліка», буйных абласных газетах і «Вячэрнім Мінску». Апошні дзень прадстаўлення тэксту перадвыбарнай праграмы кандыдата ў дэпутаты — 21 жніўня.

З 15 жніўня па 2 верасня кандыдаты атрымаюць па 5 хвілін эфірнага часу ў прайм-тайм: з 19 да 20 гадзін вечара на канале «Беларусь 3» і з 7 да 8 раніцы — на «Радыё-Мінск».

— *Першапачаткова планавалася, што кандыдаты выступяць на тэлеканале «Беларусь 2», аднак у гэты час па ім будуць трансліравацца Алімпійскія гульні, таму прадставіць столькі эфірнага часу канал не зможа,* — адзначыла **Алена ДМУХАЙЛА, член апарату ЦВК.** — *«Беларусь 3» — канал, даступны ўсім гледачам і арыентаваны на вялікую аўдыторыю, таму для кандыдатаў гэта будуць добрыя ўмовы.*

Кандыдаты Мінскай вобласці змогуць скарыстацца эфірам канала СТВ і радыё «Мінская хваля», прэтэндэнты на дэпутацкі мандат у іншых рэгіёнах могуць звярнуцца на мясцовыя тэле- і радыёстанцыі.

На тэледэбаты кандыдатам таксама даецца па 5 хвілін. Час трансляцыі выступленняў вызначыць жараб'ёўка, якую правядуць акруговыя выбарчыя камісіі. Кандыдат можа адмовіцца ад удзелу ў тэледэбатах або даслаць на іх замест сябе даверanую асобу.

Набыць дадатковы эфірны час у друкаваных СМІ і на каналах радыё і тэлебачання кандыдаты могуць за грошы са сваіх выбарчых фондаў.

— *Мы спецыяльна стараліся прыняць рашэнне па гэтым пытанні раней, каб тыя, хто ў бліжэйшыя дні пачне вылучацца, валодалі інфармацыяй пра тое, што іх чакае напярэдзе і якія выступленні яны павінны рыхтаваць,* — дадала Лідзія Ярмошына.

Назіральны савет будзе сачыць за агітацыяй у СМІ

На пасяджэнні зацвердзілі склад Назіральнага савета па кантролі за выкананнем правілаў правядзення перадвыбарчай агітацыі ў СМІ. Усе кандыдаты ў гэты орган былі вылучаны Міністэрствам інфармацыі і маюць вопыт работы ў СМІ.

— *Назіральны савет — часовы кансультатыўны орган, які ўпершыню ствараўся, каб даваць экспертныя заключэнні для Цэнтрвыбаркама, таму што сталі з'яўляцца скаргі аб прыцягненні СМІ падчас выбарчай кампаніі. Спачатку ён задумваўся толькі на перыяд перадвыбарчай агітацыі, аднак мы павялічваем тэрмін яго работы, пакуль будуць вылучацца кандыдаты ў дэпутаты. Савет будзе сачыць, каб у СМІ не было дачаснай агітацыі ў падтрымку кагосьці,* — засведчыла старшыня ЦВК.

Старшынёй савета стаў Ігар Луцкі, першы намеснік міністра інфармацыі. Пасаду яго намесніка заняў Сяргей Сверкуноў, намеснік старшыні Беларускага саюза журналістаў. Сакратаром назіральнага органа прызначана Кацярына Дубінская, генеральны дырэктар агенцтва «Мінск-навіны».

За заніжэнне даходаў могуць адмовіць у рэгістрацыі

На пасяджэнні ЦВК зацвердзілі таксама пытанні, што тычацца даходаў і маёмасці прэтэндэнтаў у Палату прадстаўнікоў.

Кандыдаты ў дэпутаты павінны падаць дэкларацыю пра даходы за мінулы год і сведчанні пра маёмасць, якая маецца ў іх уласнасці на дату падачы заявы. Упершыню пры правядзенні парламенцкіх выбараў кандыдаты, якія не маюць даходаў, павінны будуць указаць крыніцу сродкаў свайго існавання.

Калі пры праверцы сведчанняў пра даходы кандыдата (на гэта даецца тры каляндарныя дні) высветліцца, што сума яго здабытку заніжана больш як на 20% або ў дэкларацыі ўтоена пэўная маёмасць, гэта можа стаць падставай для адмовы кандыдату ў рэгістрацыі.

Пры гэтым падставай для адмовы не лічыцца, напрыклад, згадванне даходаў у выглядзе аплаты кошту пуцёвак, атрыманых у прафсаюзе яго членамі, або матэрыяльнай дапамогі.

Ірына СІДАРОК. *sidarok@zviazda.by*

■ Спадчына ў законе

НЕ НАШКОДЗЬ

Новая рэальнасць аховы артэфактаў

Адны чакалі яго з вялікай нецярплівасцю, другія баяліся. Хтосьці думаў, што ён дапаможа ўратаваць тое, што яшчэ магчыма, і нарэшце выправіць сітуацыю. Іншыя ж сцвярджалі, што гэта перакрые ім кісларод... Тым не менш Указ Прэзідэнта №485 «Аб удасканаленні аховы археалагічных аб'ектаў і археалагічных артэфактаў» быў падпісаны ў сакавіку гэтага года. Цяпер ужо не атрымаецца беспакарана хадзіць па палях, імкнучыся знайсці свой скарб ці хоць бы каштоўную манетку. Каб пасля прадаць іх на інтэрнэт-аўкцыёне і назаўсёды страціць для гісторыі і культуры краіны...



Адзін з карыстальнікаў партала metalaposhuk.by расказвае, што, калі бацька падарыў яму металашукальнік, абяцаў адкупіць яго. І слова сваё стрымаў дзякуючы гэтаму залатому пярсцёнку, знойдзенаму на радзіме дзеда. «Даведаўшыся яго кошт, крычаў таксама», — адзначае капальнік.

Аднак аматары самастойнага прыборнага пошуку ўсё адно імкнуцца вынайсці спосаб для таго, каб займацца сваімі «даследаваннямі». Ці бываюць капальнікі «белымі», ці магчыма іх супрацоўніцтва з прафесійнымі навукоўцамі? Што рабіць, калі маеш багатую нумізматычную калекцыю і непакоішся за яе далейшы лёс?.. Гэтыя і многія іншыя актуальныя для аматараў пошуку пытанні абмяркоўваліся за «круглым сталом» у Выдавецкім доме «Звязда». У ім бралі ўдзел намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па адукацыі, культуры і навуцы Наталля КУЧЫНСКАЯ, начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Ігар ЧАРНЯЎСКІ, намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вадзім ЛАКІЗА, загадчык аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вадзім КОШМАН, загадчык вучэбнай лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта БДУ, навуковы супрацоўнік Нацыянальнага гістарычнага музея Віталь СІДАРОВІЧ, метадыст па музеях і ахове гісторыка-культурнай спадчыны Ашмянскага раённага цэнтра культуры Сяргей ЖЫЛІК, а таксама аматар прыборнага пошуку, калекцыянер-нумізмат з 20-гадовым стажам Руслан ВЕРАМЕЙ.

СТАР. 7

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Турцыя перадумала плаціць за збіты Су-24

Прэм'ер-міністр Турцыі Біналі Йылдырым заявіў аб адмове ў выплаце кампенсацыі Расіі за збіты Су-24. «Аб кампенсацыі гаворкі не было, Турцыя толькі прынесла свае прабачэнні», — заявіў кіраўнік урада. Йылдырым таксама паведаміў, што зараз вядзецца судовы разбор у адносінах да асобы, якая, як мяркуецца, вінаватая ў гібелі расійскага пілота Алега Пешкава. Раней кіраўнік турэцкага Кабміна заявіў у эфіры тэлеканала TRT пра гатоўнасць Анкары выплаціць кампенсацыю за знішчэнне расійскага бамбавіка Су-24.

Петыцыю аб паўторным рэферэндуме падпісалі 3 млн брытанцаў

Жыхары Вялікабрытаніі, не згодныя з вынікамі плебесцыту, на якім крыху больш за палову ўдзельнікаў выказалася за выхад краіны з Еўрасаюза, збіраюць подпісы аб паўторным рэферэндуме. Падпісанты выступаюць за абвяшчэнне незалежнасці Лондана ад краіны і хочуць падаць заяўку на ўступленне горада ў ЕС. Свае подпісы пад дакументам паставілі ўжо звыш 3 млн чалавек. Яны настойваюць на тым, што калі на рэферэндуме яўка была ніжэй за 75%, а таксама «за» ці «супраць» прагаласавалі менш за 60%, то трэба праводзіць паўторнае апытанне. Адзначаецца, што для разгляду звароту неабходна мінімум 100 тыс галасоў. Таму ўлады Вялікабрытаніі павінны на петыцыю адрэагаваць.

У Грузіі адмянілі абавязковы прызыў у войска

У Грузіі адмянілі абавязковую службу ў войску. Адпаведны загад падпісала міністр абароны Грузіі Ціналін Хіташэлі, паведамляе «Навіны-Грузія». Адмяніць абавязковую вайсковую службу планавалі ў 2017 годзе. Міністр паставіла свой подпіс на загадзе падчас сустрэчы з грузінскімі і замежнымі журналістамі, дзе прадставіла гадавую справаздачу аб сваёй рабоце. «Адным з маіх абяцанняў на пасадзе міністра абароны было скасаванне абавязковага прызыву. Служба ва Узброеных сілах Грузіі — гэта годны занятак, і ўсе павінны хацець служыць. А хто не хоча, мы прымушаць не будзем», — сказала міністр.

15 хвілін фізічнай актыўнасці здольныя падоўжыць жыццё пажылым

Супрацоўнікі ўніверсітэцкай бальніцы Сэнт-Эцьена высветлілі: 15 хвілін фізічнай актыўнасці ў дзень дастаткова, каб знізіць рызыку заўчаснай смерці. Даследчыкі прааналізавалі даныя 1011 чалавек з Францыі ва ўзросце 65 гадоў, а таксама 122 417 добраахвотнікаў з розных краін ва ўзросце 60 гадоў. За ўдзельнікамі назіралі каля 10 гадоў. Рызыка смерці зніжалася пры ўзрастанні ўзроўню фізічнай актыўнасці. Так, у пажылых людзей з нізкімі (эквівалент 15 хвілінам хуткай хады штодня), сярэднімі і высокімі ўзроўнямі фізічнай актыўнасці рызыка заўчаснай смерці аказалася адпаведна на 22%, 28% і 35% ніжэй, чым у неактыўных удзельнікаў.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

КАРАТКА

Базавая велічыня пасля дэнамінацыі ўстаноўлена ў памеры Br21 з 1 ліпеня бягучага года.

Місія Міжнароднага валютнага фонду праявіла інтарэс да мадэлі Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень», прынятай у ім сістэме кіравання, прэферэнцый і ўмоў работы, што прадастаўляюцца рэзідэнтам і інвестарам.

Беларусь увяла часовую забарону на рух аўтатранспарту ў пункце пропуску «Дамачава» («Славацічы») на граніцы з Польшчай. Такая мера прынята ў сувязі з аварыйным станам аўтамабільнага моста цераз раку Заходні Буг у пункце пропуску.

Ноччу 1 ліпеня з 2.00 і да аднаўлення працаздольнасці АІС «Разлік» (прыкладна ў 6.00) мытныя плацяжы будуць прымацца толькі наяўнымі ў рэжыме разавых плацяжоў без спагнання ўзнагароджання з плацельшчыка.

Інспекцыя шэрагу рыбных прадпрыемстваў Беларусі, закрытых для паставак у Расію, не выявіла значных недахопаў.

Паветраныя ахоўнікі лесу

Сёлетні цёплы сезон ужо можна назваць парадаксальным. Ажно да трэцяй дэкады чэрвеня пратрымалася спрыяльная для лясоў пажарабяспечная абстаноўка. Але цяпер ртутны слупок тэрмометра пайшоў уверх, б'ючы рэкорды, ападкаў стала меней, і таму на патруляванне 9 мільёнаў гектараў беларускіх лясоў штодзённа адпраўляюцца лётчыкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Карэспандэнты «Звязды» сустрэліся з намеснікам начальніка авіяцыі па авіяцыйнай ахове лясоў аварыйна-ратавальнай установы «Авіяцыя» МНС Беларусі Анатолем КРОТАВЫМ і даведаліся пра сакрэты працы ратавальнікаў у небе.

Тэхніка праверана часам

Кожны дзень да авіятараў паступаюць спецыяльныя зводкі з Белгідрамета. Яны ўяўляюць сабой карту, на якую нанесены класы пажарнай небяспекі. Штодзённае патруляванне неба над лясамі пачынаецца ад трэцяга класа. Пасля гэтага распрацоўваецца маршрут будучага палёту, які абавязкова ўзгадняецца са спецыяльным цэнтрам, які базуецца ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск»: менавіта там вызначаюць свабодныя паветраныя калідоры.

Фота Надзеі БУЖАН.

Загадчык лётна-інспектарскага сектара Ігар ЗМІТРЭНЯ і намеснік начальніка авіяцыі па авіяцыйнай ахове лясоў Анатоль КРОТАЎ пракладваюць схему будучага маршруту.

У паветры падчас назірання экіпаж праводзіць 4 гадзіны. Час вялікі, і камфорт палёту мусіць быць як мага менш залежны ад умоў надвор'я. На ўзбраенні авіятараў МНС стаіць тэхніка, якая зарэкамендавала сябе вельмі даўно, да таго ж яна лёгкая ў абслугоўванні і рамонце. Гэта верталёты савецкай і расійскай вытворчасці МІ-2, МІ-8, МІ-26, а таксама французскія AS-350. Не спісваюць дагэтуль і легендарныя «кукурузнікі» АН-2. А ўсяго ў краіне працуюць дзесяць авіяцыйных аддзяленняў.

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X

■ Парламенцкі дзённік

САКСОНСКІ ВЕКТАР

Беларусь наведала дэлегацыя ландтага (земскага парламента) федэральнай зямлі Саксонія. Учора яе члены сустрэліся са старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаілам Мясніковічам.

— Трэба разглядаць гэты візіт у кантэксце ўзаемадзеяння Беларусі і Германіі, — лічыць Міхаіл Мясніковіч. — Нямецкі бок для нас — важны замежны партнёр, з якім выбудаваны трывалыя адносіны. Можна сказаць, што апошнім часам значна палепшыліся кантакты і з федэральнымі землямі. Але супрацоўнічаць трэба не толькі на ўзроўні бізнесу, але і на парламенцкім.

Па словах Міхаіла Мясніковіча, цяпер крыху прытармазілася дынаміка інвестыцыйнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Германіяй. Аднак можна разлічваць на аднаўленне аб'ёмаў. Тым больш што цяпер заходнія кампаніі выводзяць некаторыя актывы з краін Паўднёва-Усходняй Азіі ў эканоміку еўрапейскіх краін. І ў гэтым кантэксце можна было б разгледзець і верагоднасць выкарыстання беларускіх магчымасцяў.

Валяр'ян ШКЛЕННІК
schklennik@zviazda.by

ЭВАЛЮЦЫЯ ЯК ГАРАНТЫЯ СТАБІЛЬНАСЦІ

За ходам V Усебеларускага народнага сходу жыхары Гомельшчыны сачылі ўважліва. Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2011—2015 гады актыўна абмяркоўваецца ў многіх працоўных калектывах вобласці.

На прадпрыемствах і ў арганізацыях глядзелі трансляцыю форуму і абмяркоўвалі тэмы, паднятыя на высокім узроўні. Усебеларускі народны сход — гэта адна з формаў рэалізацыі нашых канстытуцыйных правоў, адзначае **дэкан гуманітарна-эканамічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту Валерыя ШЫБАЛОВІЧ**:

— Гэта спосаб арганізаваць маштабны дыялог паміж уладай і народам. Для мяне вельмі важна, што ёсць стабільнасць дзяржаўнай палітыкі. Мы арыентаваны на планамернае сацыяльна-эканамічнае развіццё без рэзкіх скачкоў. Паглядзіце, як у нас сёння рэалізуюцца сацыяльныя гарантыі: гэта і будаўніцтва бальніц, школ, дзіцячых садоў. Наколькі нашы людзі палепшылі свае жыллёвыя ўмовы, колькі дзетак нарадзілася ў апошнія гады! У мяне ў самой сям'я папоўнілася дваімі дзецьмі. Ёсць магчымасці і для развіцця моладзі, у тым ліку і студэнцкай. Каб нам рэалізоўваць сацыяльныя праграмы, праводзіць рэформы ў сферы адукацыі (а гэта бюджэтная сфера), патрэбны рэсурсы. Значыць, неабходна развіваць прамысловасць і сельскую гаспадарку, пашыраць рынкі збыту нашай прадукцыі, павышаць канкурэнтаздольнасць, укараняць інавацыйныя тэхналогіі, прыцягваць дадатковыя інвестыцыі. Усё гэта ёсць у праграме на наступную пяцігодку.

Адміністрацыя Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека арганізоўвала трансляцыю V Усебеларускага народнага сходу не толькі для медыцынскіх работнікаў, але і для пацыентаў. Менавіта ў гэтай установе лечаць людзей, якія пражываюць на тэрыторыях, пацярпелых ад катастрофы на ЧАЭС, нагадвае **намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека Эльдар НАДЫРАЎ:**

— Мы спадзяёмся, што клопат дзяржавы пра людзей, якія пацярпелі ад наступстваў аварыі, абавязкова працягнецца і ў наступныя пяць гадоў. Тыя паказчыкі, якія запланаваны, павінны быць выкананы: гэта і павелічэнне чаканай працягласці жыцця да 75 гадоў, зніжэнне смяротнасці ў працаздольным узросце і дзіцячай, развіццё агульнай медыцынскай практыкі.

Загадчыца кафедры эканомікі і кіравання Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф.Скарыны Іна БАБЫНА заўважае, што ўся эканоміка павінна стаць інавацыйнай па сваёй сутнасці. Напрыклад, шырокую вядомасць у свеце набыў шэраг камп'ютарных праграм беларускіх распрацоўшчыкаў, у цэлым работа Парка высокіх тэхналогій:

— Было б нядрэнна, калі б ён пачаў прырастаць за кошт стварэння новых структур у рэгіёнах. Сёння размова ідзе пра рэформы, але гэта рэформы эвалюцыйнага, а не рэвалюцыйнага характару. Для любога жыхара краіны гэта вельмі важна. Працаваць трэба ў правільна выбраным кірунку — тады будзе вынік. Таму мы павінны развівацца на прынцыпах зялёнай эканомікі і ў Рэчышчы эканомікі ведаў. Для нас сёння важна развіццё сферы паслуг, звязаных з інфармацыйнымі, камунікацыйнымі тэхналогіямі. Тут, улічваючы багаж ведаў, сістэму вышэйшай адукацыі, якая створана ў Рэспубліцы Беларусь, можна дабіцца важных поспехаў. Несумненна, прыярытэтамі будуць заставацца машынабудаванне і шэраг іншых традыцыйных галін, але неабходна шукаць новыя пункты росту, пра якія казаў Прэзідэнт краіны.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю народнага артыста БССР і СССР Расціслава Іванавіча ЯНКОЎСКАГА і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

■ Тры пытанні да ўлады

«У НАС ЗЯМЛЯ — ГЭТА СРОДАК ВЫТВОРЧАСЦІ»

Самы вялікі раён краіны — Столінскі — мае шэраг цікавых асаблівасцяў. Столін ведаюць як агурковую сталіцу, але ў прамысловых маштабах тут вырошчваюцца далёка не адны агуркі: можна ўбачыць палеткі з капустай, клубніцамі і, натуральна, бульбай. Яшчэ адна цікавінка — на Століншчыне вялікая колькасць шматдзетных сем'яў. Прычым, як мне расказвалі, ёсць вельмі шмат сем'яў, дзе выхоўваецца больш за дзесяць дзяцей. Акрамя гэтага, столінскія вёскі і гарады ў гады паводак яшчэ адносна нядаўна ператвараліся ў «беларускія венецыі». Пра тое, як сёння жыве ўнікальны палескі рэгіён, карэспандэнту «Звязды» расказаў старшыня Столінскага раённага выканаўчага камітэта Рыгор ПРАТАСАВІЦКІ.

Крыніца фота: www.polese.by

— У Столінскім раёне самыя вялікія ў краіне, жыццяздольныя вёскі. Як улады дапамагаюць вясковым людзям?

— У першую чаргу дапамагае тая палітыка, якую праводзіць Прэзідэнт. Укараненне дзяржаўных сацыяльных стандартаў дазволіла вырашыць многія праблемы і ў Столінскім раёне. У першую чаргу гэта тычыцца добраўпарадкавання дарог. Прывяду такі прыклад. За апошнія 12 гадоў у адзін толькі наш аграгарадок Альшаны ўкладзена каля 160-170 мільярдаў рублёў. Зроблена рэканструкцыя першай школы, пабудавана новая школа-дзіцячы садок на 640 месцаў, пабудаваны новы спартыўны комплекс, праведзена газіфікацыя — практычна 100% дамоў у Альшанах газіфікавана, цалкам праведзена вада. Завяршаецца будаўніцтва гравійных дарог. Каб было зразумела, што такое Альшаны: працягласць вуліц гэтага населенага пункта складае 96 кіламетраў.

У цэлым сёння на Століншчыне ўжо газіфікавана 23 населеныя пункты — таксама дзякуючы дзяржаўнай палітыцы.

Перад увядзеннем інстытута сацыяльных стандартаў у Столінскім раёне на сто дзяцей прыпадала толькі 32 месцы ў дзіцячых дашкольных установах. Цяпер на 100 дзяцей прыходзіцца 85 месцаў. Цікавы прыклад: летась у Брэсцкай вобласці было ўведзена тры дзіцячыя садкі, з іх два — у Столінскім раёне. За апошнія пяць гадоў на Століншчыне пабудаваны і дзве новыя школы.

Калі браць сферу прамысловасці, то наша торфапрадпрыемства «Глінка», дзякуючы чэшскай кампаніі Рашэліна, з'яўляецца лепшым заводам у Заходняй Еўропе па вытворчасці пажыўных грунтоў — гэта па словах кіраўніка гэтай чэшскай кампаніі. Што да сельскай гаспадаркі, то ў Столінскім раёне праведзена мадэрнізацыя 27 ферм, пабудавана з нуля 7 ферм. Штодзень у раёне вырабляецца 300 тон малака. Гэта прыкладна чацвёрты вынік у вобласці.

Калі казаць пра далейшае паляпшэнне ўмоў жыцця насельніцтва, то гэта найперш — газіфікацыя і добраўпарадкаванне дарог. Калі браць дарогі мясцовага значэння, то ў нас сёння толькі 50% з іх маюць цвёрдае пакрыццё, астатнія — гравійныя. Самая вялікая праблема — гэта тое, што вуліц у населеных пунктах з цвёрдым пакрыццём — толькі 20%.

Есць у нас і праблема чыстай вады — у ёй вялікае ўтрыманне жалеза і практычна ва ўсіх населеных пунктах трэба будаваць станцыі абезжалезвання.

Вельмі нам дапамагла і супрацьпаводкавая праграма.

У 1979 годзе ў нас была зафіксавана самая вялікая паводка. Берагавая адзнака ракі Гарынь складае 4 метры 10 сантыметраў, а падчас піка паводкі вада паднялася да адзнакі 6 метраў 56 сантыметраў. У выніку дзве трэці сушы Столінскага раёна аказваюцца пад вадой. Цалкам быў затоплены Давыд-Гарадок, па вуліцах, як у Венецыі, ездзілі на лодках. Калі ў 1999 годзе прыляцеў да нас Прэзідэнт, праграма супраць паводкі ўжо дзейнічала. Дамы ўжо не падтапляла — толькі падвор'і. Як у нас кажуць: вада прыходзіць і сыходзіць, а паляшук застаецца.

— Прэзідэнт паставіў задачу стварыць як мага больш працоўных месцаў. Якія рэзервы ёсць у Столінскім раёне?

— У нас 37 тысяч працаздольнага насельніцтва. З іх эканамічна-актыўнага — 27 тысяч, 10 тысяч працаздольнага насельніцтва ў нас займаецца індывідуальнай працоўнай дзейнасцю на асабістых падсобных гаспадарках. Мы імкнёмся максімальна ісці людзям насустрач. У нас сёння ёсць 36 фермерскіх гаспадарак, якія таксама дадаткова ствараюць працоўныя месцы. Прыватны бізнес у нас амаль штогод стварае 200-250 новых працоўных месцаў.

За апошнія 12 гадоў у адзін толькі наш аграгарадок Альшаны ўкладзена каля 160-170 мільярдаў рублёў.

Прывяду такія лічбы. Адзін мільён сто тысяч тон агародніны вырошчваецца штогод у нашай краіне — гэта па інфармацыі Белстата. Рукамі столінцаў штогод вырошчваецца і рэалізуецца прыкладна 160-170 тысяч тон. Іншымі словамі, прыкладна кожны шосты кілаграм агародніны вырошчваецца ў Столінскім раёне. Тыя ж самыя Альшаны, дзе каля 2 тысяч працаздольнага насельніцтва. Яны самастойна будуюць цяпліцы, вырошчваюць прадукцыю і рэалізуюць яе, прадаюць.

У нас вельмі працалюбівыя людзі. Яны не чакаюць, што ім нехта нешта дасць, створыць, а самі ўсё робяць. У нас людзі просяць не работу — зямлю. У Столінскім раёне зямля — гэта сродак вытворчасці.

— На Століншчыне — унікальная прырода. Што робіцца, каб прыцягнуць сюды турыстаў?

— У нас два заказнікі: «Сярэдняя Прыпяці» і «Альманскія балоты». У «Сярэдняй Прыпяці» ёсць пяць гасцявых домікаў і створаны найцудоўнейшыя ўмовы для адпачынку. Сумеснае беларуска-германскае прадпрыемства «Дамінік» стварыла на беразе ракі Прыпяць на тэрыторыі заказніка базу адпачынку, дзе адначасова можа знаходзіцца да 30 чалавек.

На тэрыторыі заказніка «Альманскія балоты» таксама будуюцца дзве вельмі сур'ёзныя базы адпачынку. У адну з іх укладваецца па некалькі соцень тысяч еўра. Сёння яны пакуль яшчэ ў стадыі будаўніцтва. Думаю, да канца года першы комплекс будзе запушчаны.

Цікавы прыклад: летась у Брэсцкай вобласці было ўведзена тры дзіцячыя садкі, з іх два — у Столінскім раёне. За апошнія пяць гадоў на Століншчыне пабудаваны і дзве новыя школы.

Надзея ЮШКЕВІЧ,
г. Столін.

■ Сітуацыя

БУЛЬДОЗЕРАМ ПА ЛЁСАХ ЛЮДЗЕЙ

У Мядзельскім раёне інвестар купіў гаспадарку і... разваліў яе

На «гарачую лінію» 5-га Усебеларускага народнага сходу патэлефанаваў жыхар Мінскай вобласці. Ён расказаў, што асобныя інвестары, якія купілі сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, як кажуць, цераз пень-калоду ажыццяўлялі вытворчую дзейнасць. А менавіта, не засявалі палі, распрадалі жывёлу, не ўкладвалі сродкі ў тэхніку, рамонт, не плацілі людзям зарплату. Абласное кіраўніцтва адразу правяло расследаванне з удзелам журналістаў.

У 2004 годзе многія айчынныя бізнесмены і дзяржаўныя суб'екты гаспадарання ўзялі пад сваю апеку стратныя прадпрыемствы, з тым каб зрабіць іх паспяховымі. Садзейнічалі гэтаму ўказы Прэзідэнта ад 19 сакавіка 2004 года №138 «Аб некаторых мерах па фінансавым аздараўленні сельскагаспадарчых арганізацый і прыцягненні інвестыцый у сельскагаспадарчую вытворчасць» і ад 14 чэрвеня 2004 года №280 «Аб парадку і ўмовах продажу юрыдычным асобам прадпрыемстваў як маёмасных комплексаў стратных сельскагаспадарчых арганізацый». Гэтыя дакументы давалі новым гаспадарам шмат прэферэнцый і льгот. У прыватнасці, сімвалічная цана пакупкі, льготныя крэдыты на закупку тэхнікі, будаўніцтва жылля. Абавязковымі ўмовамі продажу было захаваць вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі, палепшыць вынікі фінансава-эканамічнай дзейнасці.

Менавіта тады кіраўнік мінскага прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Цепласеткі» Міхаіл Шурым набыў у Мядзельскім раёне стратны сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў «Вішнеўскае».

— Інвестар выязджаў на месца, наведаў розныя прадпрыемствы, але спыніўся менавіта на гэтым. Гаспадарка працавала, валодала вытворчымі магутнасцямі, дойным статкам, але эканамічная сітуацыя была складанай, — расказаў Леанід Берняковіч, які тады займаў пасаду намесніка старшыні райвыканкама па эканоміцы. — Кошт маёмаснага комплексу на той момант складаў больш як 828 млн рублёў. Інвестар купіў яго крыху больш як за 165 млн рублёў (75 тыс долараў). Прычым, гэтыя сродкі паступілі не ў раённы або рэспубліканскі бюджэт, а на рахунак новага прадпрыемства «Вішнеўскае-Агра».

Сам інвестар сцвярджае, што пакупка гаспадаркі разам з даўгамі яму абышлася ў паўмільёна долараў, а ў цэлым у яе развіццё ён уклаў каля 2 млн долараў.

Новы ўласнік абяцаў не толькі фінансава аздаравіць гаспадарку, але і зрабіць яе «астраўком дабрабыту» для мясцовых насельнікаў. Напачатку эканоміка трымалася на напрацаваным раней падмурку, а потым пакацілася па нахільнай. Сітуацыя з кожным годам пагаршалася, паказчыкі зніжаліся.

— У прыватнасці, тэмпы росту вытворчасці валавой прадукцыі ў 2012-м у параўнанні з 2006 годам склалі: у жывёлагадоўлі 56,5%, раслінаводстве 56,7%, вытворчасці буйной рагатай жывёлы 60%, вытворчасці малака 37%, яго рэалізацыі 38%. А сярэдні надой ад каровы 64%, — прывёў звесткі старшыня райвыканкама Анатоль Вайнілка.

Пасля завяршэння дзеяння Указа Прэзідэнта льготы спыніліся, настала пара вяртаць даўгі па лізінгу, крэдытах. Інвестар пачаў шукаць выхад з сітуацыі шляхам рэарганізацыі. На базе «Вішнеўскага» з'явіліся прыватныя вытворчыя ўнітарныя прадпрыемствы «МТФ «Сырмеж» і СК «Буйкі», а таксама сялянская фермерская гаспадарка «Касцевічы-Агра» па вырошчванні трусоў. Апошнюю ўзначаліла жонка Міхаіла Шурыма — Святлана. Але кіравала ёй са сталіцы...

— Я ўвесь час працавала начальнікам участка, а мой муж кіраўніком сялянскай гаспадаркі. Пры звальненні высветлілася, што па штатным раскладзе я лічылася кіраўніком. Звольнілася, таму што практычна не бачыла зарплаты. Дадуць мільён, астатняе абяцаюць вярнуць. Цярпенне лопнула. А ў 2014 годзе нечакана памёр муж. Не было за што пахаваць. Звярталася па дапамогу да Святланы і Міхаіла Шурымаў. Але тыя сказалі, што грошай няма, — са слязамі на вачах згадвае Вольга Лазарава.

Жанчына падала іск у суд, па яго рашэнні Святлана Шурым павінна выплаціць заяўніцы даўгі па заробках. Але да гэтага часу грошай яна не атрымала.

— Грошы, якія ўкладваліся ў гаспадарку, ішлі ў асноўным на выплату зарплаты, абаротку, а мадэрнізацыя, рэканструкцыя, рамонт аб'ектаў не вяліся, — адзначаюць мясцовыя ўлады.

У выніку вытворчыя памяшканні, у першую чаргу будынкі жывёлагадоўчых фермаў «Сырмеж» і «Астраўляны» прыйшлі ў заняпад. У любы час апорныя канструкцыі, дах маглі абваліцца і пахаваць пад сабой работнікаў і жывёлу. На прадпісанні санітарнай, пажарнай службы, раённага аддзела Міністэрства па надзвычайных сітуацыях аб ліквідацыі недахопаў інвестар не рэагаваў. Па рашэнні райвыканкама 771 карову перамясцілі ў суседнюю гаспадарку на часовае ўтрыманне. Уласніку ўстанавілі тэрмін, на працягу якога ён павінен адрамантаваць і прывесці ў належны выгляд памяшканне. Але патрабаванні ён не выканаў.

У свой час Міхаіл Шурым набыў у лізінг тэхніку з падтрымкай дзяржавы: аўтамабілі, трактары, пагрузчыкі. Але, як сцвярджаюць у райвыканкаме, працавалі яны не на палях гаспадаркі, а на асноўным прадпрыемстве інвестара «Цепласеткі» ў Мінску. «Прамагралізінг» з дапамогай суда тэхніку забраў, але інвестар застаўся вінны яшчэ больш як 300 млн рублёў. «Белагрансервіс» таксама частку машын вярнуў. А вось трактар «Беларус-3022» інвестар прадаў, на што не меў ніякага права.

Ахвярамі сітуацыі сталі людзі, па лёсах якіх нібы бульдозерам прайшоўся інвестар. Па першае, яны страцілі работу, многім да гэтага часу не выплачана зарплата. Акрамя таго, многія сем'і, у тым ліку і шматдзетныя могуць апынуцца на вуліцы.

— Я 15 гадоў працаваў у калгасе тэхнікам-асемянатарам. Калі атрымліваў жыллё, у нас з жонкай было чацвёра дзяцей. Цяпер з намі жыве непаўналетняя дачка. А на днях мы атрымалі паведамленне да 1 ліпеня выселіцца, — амаль плача Аляксандр Кукін. — У нас няма іншай жылплошчы. Куды нам ісці? Яшчэ ў мінулым годзе спрабавалі прыватызаваць жыллё. Але, як аказалася, мы да гэтага часу там не прапісаны, паколькі інвестар не афарміў праваўстаноўчыя документы на пяць дамоў, пабудаваных з дапамогай банкаўскіх крэдытаў.

Да гэтага часу крэдыты не пагашаны. Жыллё плануюць прадаць, каб вярнуць даўгі, а людзей папрасілі з рэчамі на выхад.

У непрыемнай сітуацыі аказаліся і жыхары тых дамоў, якія ўзведзены яшчэ пры калгасе і перайшлі ва ўласнасць інвестара разам з іншай нерухомасцю. Яны таксама не аформлены.

— Нас палохае нявызначанасць, няпэўная будучыня, — мясцовыя жанчыны ў роспачы. — Прыватызаваць без дакументаў мы свае кватэры не змаглі. Значыць, з 1 ліпеня будзем плаціць за жыллё, як за арэнднае. А дзе гарантыя, што нас адсюль не выганяць?

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

У тэму

Сяргей ЮРКЕВІЧ, намеснік старшыні Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінаблвыканкама:

— Не ўсе інвестары на Міншчыне працуюць так, як Міхаіл Шурыма. Ёсць і станоўчыя прыклады. На Уздзеншчыне гаспадарку выкупіла кампанія «Вітэкс» і зрабіла яе адной з лепшых у вобласці.

Усяго з пачатку дзеяння ўказаў №280 і 138 інвеставана ў 95 сельгасарганізацый. 20 з іх перададзена ў камунальную ўласнасць з розных прычын. У асноўным гэта рашэнне саміх інвестараў, паколькі дзеянне прэферэнцый закончылася і ім стала цяжка працаваць. Цяпер у Мінскай вобласці засталося 57 інвеставаных гаспадарак. На стадыі вырашэння пытанне аб перадачы 4 у камунальную ўласнасць.

Паветраныя ахоўнікі лесу

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Верталёт МІ-8 можа цягнуць да трох тон вады. МІ-26 здольны даставіць да месца пажару ў 5 разоў болей. Такая гіганцкая грузапад'ёмнасць абумоўлена тым, што лясны пажар распаўсюджваецца вельмі імкліва — хуткасць яго за хвіліну можа дасягаць 50-60 метраў. А з аднаго зліву магчыма затушыць да 150 метраў агнявога фронту. Праўда, тут ёсць адзін нюанс. Час падлёту ад моманту забору вады да скідвання не можа перавышаць 10 хвілін, бо інакш агонь адваюе страчаныя пазіцыі. І ў працяглае спякотнае надвор'е мы сутыкаемся з такой сітуацыяй: на карце вадаём нанесены, да яго падлятаем — а ён перасох. Ці разам з вадой чэрпаецца вельмі шмат бруду.

Самалёт АН-2 тушыць пажары па-іншаму. Унутры яго фюзеляжа ўстаноўлены спецыяльныя прылады, якія запаўняюцца вадой. Ёй пасля пілот і «страляе» прыцэльна па агні.

«Самая высокая інтэнсіўнасць пажару — з 15 да 18 гадзін»

У святочныя і выхадныя дні ўсе імкнуцца паехаць за горад, бліжэй да вады ці ў лес. Але ж не ўсе адпачывальнікі задумваюцца пра тое, што справакаваць пажар можа незатушаная цыгарэта ці нават аскепак шкла ад бутэлькі, які працуе як збіраючая лінза.

— Пажары ў экасістэмах падзяляюцца на нізавыя і верхавыя. Прычым апошнія, якія распаўсюджваюцца па кронах дрэў, распаўсюджваюцца далёка не так, як тое паказваюць у фільмах. Такі агонь нібы гуляе ў хованкі — то асядае, то паднімаецца. Лётчык-назіральнік па колеру дыму адразу можа вызначыць інтэнсіўнасць пажару і яго тып. Пры верхавым дым мае цёмны колер, а пры нізавым — больш шызаватае адценне.

Гасіць верхавы пажар наземнымі сіламі вельмі цяжка і рызыкоўна. Таму ад яго адступаюць як мінімум на паўтара кіламетра, прабіваюць апорную паласу бульдозерамі і робяць ад яе адпальванне.

— Па тэлевізары ўсе не аднойчы бачылі, як тушаць пажары ў экасістэмах. Але мала хто ведае, што існуе залежнасць інтэнсіўнасці пажару ад часу сутак. Мацней за ўсё агонь гарыць з 15 да 18 гадзін. Бліжэй да ночы вільготнасць паветра павялічваецца, і полымя прытухае. Вось з 8 да 11 гадзін вечара эфектыўнасць дзеяння наземных сіл максімальная. Другі такі перыяд каротка — ад досвітку і прыкладна да 7-8 гадзін раніцы.

Фота Надзеі БУЖАН.

Вінтакрылыя машыны гатовы ўзмыць у неба.

Як палепшыць сітуацыю на Гомельшчыне?

Часцей за ўсё ў Беларусі пад удар агню трапляюць саснякі і ельнікі. Гэтых лясоў у нас крыху менш за палову ад іх агульнай колькасці. Вельмі шмат іх расце ў Гомельскай вобласці, па якой амаль штогод пракатваюцца істотныя лясныя пажары.

— Так званыя «спелыя лясы» ад агню церпяць не так моцна. Як правіла, яны складаюцца з даволі вялікіх дрэў вышынёй 30 метраў і болей. У іх унізе вельмі шчыльная кара, якая выконвае ролю ізаляцыі. А вось маладняк, які саджаюць на месцы колішніх высечак, агонь вынішчае пад корань. І гэта самае крыўднае: тыя ж сосенкі прыжыліся, здавалася б, паступова вырасце гай, а даводзіцца перарабляць усё нанова. Ды і пакуль маладняк вырасце, пройдзе не адзін дзясятак гадоў. Ёсць свае асаблівасці і пры рабоце ў Чарнобыльскай зоне. Там не прыбіраецца ветравал, з-за чаго агню распаўсюджвацца яшчэ зручней.

Калі зірнуць на карту Беларусі, то адразу ж будуць заўважныя выступы, асабліва на літоўскай і ўкраінскай межах. Гэта таксама адбіваецца на рабоце лётчыкаў — як бы там ні было, але залятаць на тэрыторыю іншай дзяржавы нельга.

— Балтыйскі напрамак для нас ціхі — пажары ў памежных раёнах там здараюцца вельмі рэдка. А вось лясное памежжа на поўдні — сапраўдны галаўны боль. Лётчыкі і пілоты ўжо вывучылі беларуска-ўкраінскую мяжу на памяць. Вельмі шмат пажараў заходзіць да нас адтуль. І калі ж мы з паветра бачым, што да нашай мяжы агню засталося каля сотні-дзвюх метраў, мы ж нічога са стыхіяй зрабіць не можам! Спрабавалі дамовіцца, што калі на Беларусь насоўваецца пажар і да мяжы застаецца вельмі мала, то мы маглі б высадзіць на ўкраінскай тэрыторыі дэсант, які б ліквідаваў узгаранне і вярнуўся б назад. На вялікі жаль, паміж Беларуссю і Украінай адсутнічае пагадненне аб узаемадзеянні паветраных сіл ратавальнікаў. А вось калі я працаваў у Сібіры, то паміж Расіяй і Манголіяй такая дамова існавала. І пры пажарах на мангольскай тэрыторыі расійскія паветраныя караблі маглі залятаць на пяцьдзясят кіламетраў ад мяжы...

Знайсці «рабінзона»

Таксама авіятары шукаюць зніклых у лесе людзей. Але іх падключаюць толькі тады, калі наземныя пошукі ніякага плёну не прынеслі. За год такіх вылетаў здараецца 15-20.

— Тыповая сітуацыя: пайшла бабуля ў лес у ягады ці грыбы, дадому не вярнулася. Яе шукаюць некалькі дзён, але беспаспяхова. Аднак перш чым вылецець на пошукі, мы павінны ведаць усю абстаноўку. І вельмі часта кажуць нам, што чалавек быў, напрыклад, у шэранькай куртачцы з блакітным вядром. Вось і ўявіце сабе, як пілоту ці лётчыку-назіральніку разгледзець гэтае блакітнае вядзёрка з вышыні ў дзвесце метраў, ды яшчэ і сярод дрэў! Гэта ўжо не кажучы пра тых, хто апранаецца ў вопратку колеру хакі. Чалавека, напрыклад, мы здолеем заўважыць толькі на адкрытай прасторы. Ды і тое, калі ён будзе апрануты ў адзенне колеру, які рэзка адрозніваецца ад зялёнага і пачне прыгуку верталёта прыцягваць да сябе ўвагу — скажам, круціць той жа курткай над галавой. Быў у нас рэкордны выпадак, калі мы знайшлі бабулю, якая заблукала ў лесе, праз месяц пасля таго, як яна знікла. Але зноў жа, заўважылі мы яе на балоце — адкрытай прасторы з нізкарослай расліннасцю.

Аднак крэатыву людзям не займаць нават у такой, здавалася б, экстрэмальнай сітуацыі.

— Неяк нам паведамілі, што прапалі людзі дзесьці на балоце пад Талькай. Тут ужо без нашай дапамогі было не абысціся. «Рабінзоны» — дзве жанчыны і два мужчыны, пачуўшы гук верталёта, запалілі вогнішча. Так іх па дыме і знайшлі. Справа ў тым, што дым вогнішча для прафесіянала заўважны з паветра на адлегласці ажно ў два дзясяткі кіламетраў! Ну а далей, як кажуць, справа тэхнікі.

Ці вось успамінаю свой сібірскі досвед. Даволі часта дзеля ліквідацыі пажараў даводзілася скідваць парашутыстаў. Патушылі яны пажар, а мы па іх вылецець не можам з-за дрэнных умоў надвор'я. Ну і што рабіць у такім выпадку? Дэсантнікі прымалі рашэнне прабівацца да цывілізацыі пешшу. Але і сляды за сабой таксама пакінуць трэба. Таму яны з падручных матэрыялаў — звычайна гэта каменне і жэрдкі — выкладвалі гіганцкую стрэлку, якая і паказвае напрамак, у якім яны сышлі. Дзякуючы гэтаму мы іх і знаходзілі пры першай жа магчымасці вылецець.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

■ Лета кліча

ХТО ПРАЦУЕ, ТОЙ І АДПАЧЫВАЕ

Як школьнікі зарабляюць свае першыя грошы ў летнім лагеры

На гадзінніку крыху больш за 9 раніцы, а ў гімназіі №37 г. Мінска праца ўжо ідзе поўным ходам. У гэты час школьнікі актыўна арудуюць... лыжкамі, каб набрацца сіл для больш сур'ёзных заданняў. Менавіта так пачынаецца кожны дзень у гарадскім лагеры працы і адпачынку.

ІЛЮЗОРНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

У адрозненне ад падманлівых абяцанняў у інтэрнэце, гэта сапраўды рэальная магчымасць для непаўналетніх зарабіць грошы і атрымаць карысны вопыт. Самастойна школьніку знайсці працу на лета вельмі цяжка. Прадпрыемствы і гандлёвыя арганізацыі не надта жадаюць супрацоўнічаць з досыць складанай катэгорыяй работнікаў: нізкія запыты ў аплаце кампенсуюцца часта безадказным стаўленнем да абавязкаў і мноствам абмежаванняў, звязаных з найманнем непаўналетніх. У перыяд крызісу працу складана знайсці нават спецыялістам, не кажучы ўжо пра тых, хто, калі быць аб'ектыўнымі, яшчэ практычна нічога не ведае і не ўмее. Але ж прыцягальную вакансію можна адшукаць з лёгкасцю: практычна з кожнага слупа прызыўна вабіць рэклама аб простай працы, якая шчодра аплачваецца і прызначаецца менавіта для школьнікаў. Здавалася б, што складанага можа быць у тым, каб расклеіць некалькі дзясяткаў аб'яў ці раздаць усяго пару соцень улётак? Цяжкасці ўзнікаюць на этапе атрымання заробку. Ветлівыя працадаўцы ператвараюцца ў... агрэсіўных незнаёмцаў. Усё таму, што дамаўляюцца звычайна аб такой працы толькі на словах, самавітыя «бізнесмены» падпісаць дагавор не прапануюць, а сарамлівым школьнікам першым пачынаць размову аб гэтым часцей за ўсё неяк няёмка. Вось і атрымліваюць у выніку няўдачлівыя работнікі замест вялікага заробку толькі вялікае расчараванне.

У лагерах працы і адпачынку ўсё зусім па-іншаму. «Такі від занятасці сапраўды надзейны. Дзякуючы яму ў школьнікаў з'яўляецца магчымасць атрымаць працоўную кніжку і страхавую картку. Для мяне гэта было сур'ёзным аргументам за такі пачатак працоўнай дзейнасці, — разважае Аня Ломжа, якая перайшла ў 11 клас. — Да таго ж заданні вельмі лёгкія. Здаецца, я б з такімі і ў шостым класе справілася», — ужо весела дадае дзяўчына.

Але ўмовы прыёму ў лагер дакладна вызначаны. Згодна з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, пачаць працаваць можна з 14 гадоў, таму часцей за ўсё ў дзейнасці такіх лагераў задзейнічаны былыя дзесяцікласнікі.

ПАДСОБНЫЯ РАБОТЫ? НАМ БЫ Ў АФІЦЫЯНТЫ...

— Сёлета сапраўдны пік папулярнасці лагераў працы і адпачанку. Калі ў мінулым годзе я ледзь знайшла трох чалавек, то ў гэтым — далёка не ўсіх ахвотных удалося працаўладкаваць, — дзеліцца назіраннямі намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Юлія Дзмітрыеўна Скадорва. — Пасля таго, як я абвясціла пра такую магчымасць, быў ажыятаж. Але многія, як толькі даведваліся аб тым, *што* менавіта трэба рабіць, адразу ж адсейваліся. «Рваць пустазелле, фарбаваць плот і наводзіць парадак у вучэбных кабінетах? Вы што, жартуеце? Нам бы афіцыянтамі папрацаваць», — абураліся некаторыя школьнікі. У той час як іншыя з радасцю ўхапіліся за магчымасць зарабіць крыху на кішэнныя выдаткі. Змена, як і ў любым іншым летніку, доўжыцца 18 дзён, падчас якіх можна атрымаць 1,5 мільёна рублёў. Гэта нядрэнная сума за палову працоўнага дня. Калі быць дакладным, ён павінен складаць 4 гадзіны 36 хвілін, — усміхаецца Юлія Дзмітрыеўна.

...Тым часам яшчэ трохі сонныя юныя работнікі ўжо справіліся са сняданкам і гатовыя да новых здзяйсненняў. Яны ажыўлена балбочуць, гадаючы, якое заданне ім дастанецца сёння.

—Толькі не фарбаваць плот, толькі не фарбаваць плот! — нібы зачараваны, паўтарае Дзіма Строеў.

— О, так! Цудоўна было б хоць сёння абысціся без гэтага, — падтрымлівае яго сябар Лёша Луцук.

— А я не супраць кветкі паліваць. Праўда, здаецца, дождж абяцалі, — расчаравана дадае Аня.

— Лагеры працы і адпачынку арганізоўваюцца ў кожнай сярэдняй навучальнай установе. Часцей за ўсё ў чэрвені: па-першае, у гэты час у школах сапраўды шмат працы, па-другое, потым большасць дзяцей раз'язджаецца. З 5-га па 8-ы клас вучні павінны праходзіць абавязковую пераводную практыку. Па сутнасці, лагер працы і адпачынку — гэта тое самае, хіба заданні на парадак складанейшыя, але пры гэтым за іх выкананне плацяць грошы, — тлумачыць Юлія Дзмітрыеўна. — Толькі ў лагеры многія першы раз сутыкаюцца з фізічнай працай. Яны ж нават рыдлёўку ў руках трымаць не ўмеюць!

— Гэта няпраўда. Усё мы ўмеем! — крыўдзяцца дзеці.

— Я ўсяго пару разоў не магла кветку ад пустазелля адрозніць, — абараняецца Аня.

ІЛЬГОТНІКІ І ВЫДАТНІКІ — ПЕРШЫЯ Ў ЧАРЗЕ

— Да нас бацькі прыходзяць з удзячнасцю, што дзеці не сноўдаюцца без справы, а вучацца простым, але карысным рэчам. Праўда, для таго, каб трапіць у лагер працы і адпачынку, патрэбна іх пісьмовая згода. Таксама неабходна медыцынская даведка, у якой часта ўказваюцца абмежаванні ў працы. Летась хлопчык прынёс нам даведку, у якой быў вялізны спіс забарон. Мы вымушаны былі яму адмовіць, таму што да здароўя трэба ставіцца вельмі сур'ёзна. Акрамя таго, ёсць афіцыйна зацверджаны пералік дазволеных работ: напрыклад, школьнікам нельга ўзаемадзейнічаць з хімікатамі ці падымаць цяжары, — падрабязна расказвае Юлія Дзмітрыеўна. — У першую чаргу мы прапануем працу дзецям з няпоўных, шматдзетных сем'яў — тым, хто аб'ектыўна мае патрэбу ў дадатковых сродках. І часцей за ўсё яны сапраўды адклікаюцца. Толькі пасля таго, як мы арганізуем занятасць для іх, звяртаемся да ўсіх астатніх. Цяпер у нас задзейнічаны 6 чалавек. Двое ўжо паспелі папрацаваць у маі (па дзве гадзіны на дзень). Акрамя лагера працы і адпачынку, ёсць яшчэ другасная занятасць. Мы спрабавалі наладзіць сувязь з ЖРЭУ, але ў іх цяпер не хапае працы нават для спецыялістаў. У ліпені мы частку школьнікаў накіруем у «Мінскзеленбуд», гэта праект, арганізаваны сумесна з БРСМ.

«Рваць пустазелле, фарбаваць плот і наводзіць парадак у вучэбных кабінетах? Вы што, жартуеце? Нам бы афіцыянтамі папрацаваць», — абураліся некаторыя школьнікі.

Праблем з паводзінамі ў лагеры не ўзнікае. Усе праходзяць абавязковы інструктаж, і правілы бяспекі выконваюцца беспярэчна. І ўсё ж перавагу мы аддаём надзейным хлопцам і дзяўчатам з добрай паспяховасцю. Тых, каму не ўдалося трапіць у лагер цяпер, я ўнесла ў спіс на наступны год. Калі яны выкажуць жаданне, іх кандыдатуры будуць разглядацца ў першую чаргу. У лагер працы і адпачынку і на другасную занятасць мы вызначаем розных падлеткаў, каб у кожнага была магчымасць праявіць сябе.

ЗАБАЎКІ — ТОЛЬКІ ПА ЖАДАННІ

Хочацца падкрэсліць, што нездарма лагер носіць назву менавіта працы і адпачынку. Хлопцы і дзяўчаты якасна выконваюць пастаўленыя перад імі задачы, дарослыя ж, у сваю чаргу, займаюцца арганізацыяй іх вольнага часу. У распараджэнні моладзі знаходзіцца трэнажорная зала з усім спартыўным інвентаром, даволі часта яны ходзяць у кіно, тэатры, на выстаўкі. Але ўсё гэта — толькі па жаданні, ніякай абавязковай праграмы. Акрамя таго, з імі працуе псіхолаг. Вучні вельмі любяць пасля працы зайсці да яго, каб выканаць якія-небудзь цікавыя тэсты на прафарыентацыю ці больш асабістую тэму.

— А яшчэ з «забаў», нашы любімыя — сняданак і абед, — жартуюць дзеці.

На гадзінніку ўжо амаль 12. Дзяўчынкі займаюцца праполкай яркіх, пышных кветнікаў, хлопцы разбіраюць шафы ў адным з кабінетаў.

— Можна, я ўжо адпачну? Крышку пасяджу? — гаворыць сам з сабой Алёша. — Добра-добра. Сілы ж яшчэ ёсць. Што яшчэ трэба зрабіць? — ужо значна гучней пытаецца ён.

Як толькі ўзнікае пытанне, на што яны плануюць патраціць свой першы заробак, усе заўважна ажыўляюцца.

— Хачу нарэшце сам адрамантаваць тэлефон, — з гонарам заяўляе Дзіма.

— Я прапусціла занадта шмат канцэртаў. Буду наганяць, — задумліва кажа Аня.

— А ў мяне будзе вясёлае лета, — бадзёра адказвае Лёша.

— Я ўкладу грошы ў ровар!

— А я — у новы скейтборд!

— Збіраю на гульнявы камп'ютар!

— А ў мяне будзе найлепшае лета ў жыцці! — чуюцца вясёлыя галасы.

— Нягледзячы на ўсю сур'ёзнасць і працавітасць, гэта яшчэ зусім дзеці, — з усмешкай разводзіць рукамі Юлія Дзмітрыеўна.

Дар'я КАСКО

■ Гендар

СПРАВА Ў ЗАЙЗДРАСЦІ?

Прабівацца на высокія пасады жанчынам замінаюць... іншыя жанчыны

«Мы маем гендарную роўнасць па дакументах, але па факце яе няма. Усе даследаванні паказваюць, што мінімум 50 гадоў пройдзе, перш чым мужчыны і жанчыны стануць роўнымі ў эканамічных і палітычных пытаннях», — лічыць доктар Марчын ВАЛЕЦКІ, эксперт Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ. Жанчыны радзей займаюць высокія пасады. За іх неахвотна галасуюць нават іншыя дамы, а калегі ў парламенце ставяцца з недаверам. Чаму так адбываецца, абмяркоўвалі на Міжнародным форуме жанчын-лідараў, арганізаваным АБСЕ сумесна з БДУ.

РАШУЧАЯ ЖАНЧЫНА — ІСТЭРЫЧКА?

Летась ААН прадставіла даклад аб становішчы жанчын на глабальным і рэгіянальным узроўнях. Эксперты прааналізавалі каля 200 паказчыкаў і адзначылі, што за апошнія 20 гадоў жыццё дам значна палепшылася. Аднак дыскрымінацыя па-ранейшаму застаецца. Шлях у вялікі бізнес для многіх закрыты. Напрыклад, у 2014 годзе ў шасці сусветных эканамічных установах, якія ўваходзяць у лік найбольш уплывовых, доля жанчын у кіраўніцтве складала ад 4 да 20 працэнтаў. Амаль тое ж самае і з удзелам у палітыцы. У ліку кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў толькі 19 жанчын. Сярод парламентарыяў у сярэднім па свеце доля прадстаўніц прыгожага полу — 22 працэнты, сярод міністраў — 18 працэнтаў.

Латвійскія антраполагі праводзілі цікавае даследаванне — вывучалі, хто прызначаны мэрам у розных гарадах. І высветлілі, што вялікімі гарадамі кіруюць у асноўным мужчыны, а маленькімі (дзе праблем больш) — жанчыны.

Чаму дамам складана прабіцца на высокія пасады ў палітыцы?

— Заўсёды так: тым, хто ўжо быў у гэтай сферы, лягчэй застацца. Мужчыны ва ўладзе даўно, а жанчыны ўвайшлі ў палітыку вельмі позна, іх па-іншаму ўспрымаюць, — лічыць **дырэктар Інстытута прыкладных сацыяльных навук Варшаўскага ўніверсітэта, былы міністр па гендарнай роўнасці Польшчы Малгажата ФУШАРА.**

Прафесар Фушара вывучала, як ставяцца да дам у палітыцы ў шасці парламентах Еўропы. Былі выбраны тры заходнееўрапейскія і тры постсавецкія краіны. Аказалася, што ўсюды ўласцівы адны і тыя ж стэрэатыпы.

— Мужчыны ўспрымаюцца як дзеячы ў публічнай сферы, а жанчыны — у хатняй, і гэта складана пераадолець. Кабет пастаянна ацэньваюць па знешнім выглядзе. Усе каментуюць, як дама прыбралася, і ніхто не гаворыць так пра мужчын, — заўважае дырэктар інстытута.

Жанчын папракаюць іх эмацыйнасцю. Маўляў, гэта не сумяшчаецца з палітыкай.

— Але гэта рыса характару ўласціва абодвум полам, — настойвае Малгажата Фушара. — Праўда, калі мужчына рэзка выкажацца ці прыме рашэнне на гарачую галаву, падумаюць, што ён рашучы, а калі так дзейнічае жанчына — істэрычка.

НЕ ПРОСТА ФАРМАЛЬНАСЦЬ

Старшыня камітэта па еўрапейскіх справах Сейма Латвіі Лаліта ЧЫГАНЭ ўпэўнена: статыстыка пра долю жанчын-кіраўнікоў не адлюстроўвае сітуацыю цалкам. Бо сферы адказнасці кабет і мужчын на высокіх пасадах вельмі адрозніваюцца.

— Латвійскія антраполагі праводзілі цікавае даследаванне — вывучалі, хто прызначаны мэрам у розных гарадах. І высветлілі, што вялікімі гарадамі кіруюць у асноўным мужчыны, а маленькімі (дзе праблем больш) — жанчыны. Дамы выконваюць цяжкую працу, а мужчыны — стрыгуць грошы! — выказалася Лаліта Чыганэ.

Знешнасці жанчын у публічнай сферы надаюць зашмат увагі, згодна эксперт. І прыгадвае выпадак, які адбыўся з антраполагамі ў адным з гарадоў. Калі даследчыкі былі на прыёме ў мэра, той звярнуўся да дампадначаленых: «Прыгожыя застаюцца з намі піць каву, непрыгожыя ідуць яе рабіць».

Наконт перашкод у кар'еры ў Лаліты Чыганэ свая думка.

— Займаць жанчынам высокія пасады замінаюць... іншыя жанчыны. Яны зайздросяць калегам і не даюць прасоўвацца па службовай лесвіцы, — дзеліцца яна сваімі назіраннямі.

Забяспечыць сабе месца ў палітыцы дамы спрабуюць праз устанаўленне квот. У красавіку ў Малдове прынялі закон, які прадугледжвае, што мінімум 40 працэнтаў членаў урада павінны быць жанчыны. Тая ж квота абавязковая для спісаў кандыдатаў у палітычныя фарміраванні на ўсіх ўзроўнях выбараў. Зацвярджэнне гэтага дакумента ў краіне лічаць гістарычным.

— З іншага боку, мне здаецца, мы зацыкліліся выключна на фармальным боку гендарнай роўнасці, не спрабуем капаць глыбей. Ствараюцца сотні арганізацый, кожная з якіх выконвае сваю маленькую задачу, але яны дзейнічаюць разрозненa і не дабіваюцца большага. У выніку ствараецца ўражанне, што барацьба за роўныя магчымасці для жанчын ператвараецца ў самамэту, — лічыць **былы прэм'ер-міністр Малдовы, дэпутат Зінаіда ГРАЧАНАЯ.** — Якая, напрыклад, розніца, колькі ў парламенце будзе жанчын: 39 ці 40 працэнтаў? Галоўнае, каб яны сапраўды ўдзельнічалі ў прыняцці рашэнняў.

БЕЗ АДРЫВУ АД СЯМ'І

Гендарную сітуацыю ў Беларусі замежныя эксперты ацэньваюць пазітыўна. Значны прагрэс, дасягнуты за апошнія гады, адзначае і **міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА.** Беларусь уваходзіць у лік 16 краін свету, дзе індэкс чалавечага развіцця жанчын роўны або пераўзыходзіць аналагічны паказчык сярод мужчын. Сёння ў вышэйшых органах заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады жанчын — 55 працэнтаў, у парламенце — амаль 30.

У ліку кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў толькі 19 жанчын. Сярод парламентарыяў у сярэднім па свеце доля прадстаўніц прыгожага полу — 22 працэнты, сярод міністраў — 18 працэнтаў.

— Але для нас важны не столькі факт выканання мерапрыемстваў Нацыянальнага плана дзеянняў па забеспячэнні гендарнай роўнасці, колькі іх доўгатэрміновы эфект і пазітыўны ўплыў на стаўленне грамадства да гэтых пытанняў. Праблемы роўнасці павінны ўспрымацца ў кантэксце агульнага сацыяльна-эканамічнага становішча, а не як праблемы жанчын, — выказалася міністр.

— Галоўная задача, — лічыць Марыяна Шчоткіна, — прадаставіць дамам магчымасці для рэалізацыі свайго патэнцыялу. Мы імкнёмся стварыць такія ўмовы з боку дзяржавы, каб у жанчын атрымлівалася спалучаць і сямейныя абавязкі, і прафесійныя. Таму што мы ў Беларусі не адрываем жанчыну ад сям'і. Дзеці, муж таксама важныя.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. lubneuskaya@zviazda.by

■ Разумныя грошы

ПРЫШЧЭПКА АД «КЛАВІЯТУРНЫХ ШПІЁНАЎ»

СПЕЦЫЯЛІСТЫ РАЯЦЬ НА СВАЁЙ СТАРОНЦЫ ІНТЭРНЭТ-БАНКІНГУ ПЕРЫЯДЫЧНА МЯНЯЦЬ ПАРОЛЬ

У мінулых матэрыялах нашай рубрыкі мы пазнаёмілі чытачоў з усімі нюансамі выкарыстання пластыкавых картак. Сёння пагаворым аб выкарыстанні сістэм дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання (ДБА), аб мабільным банкінгу і электронных кашальках. У гэтым нам дапамагае пакрокавы дапаможнік, які быў распрацаваны Нацыянальным банкам краіны.

Не «чапайце» сумніўных сайтаў

Для сапраўды прасунутых інтэрнэт-карыстальнікаў набыццё тавараў праз сістэму ДБА ўжо не з'яўляецца нейкай складанай таямніцай. Але нават ім спецыялісты раяць быць заўсёды нагатове і пры выкарыстанні інтэрнэт-банкінгу звяртаць увагу на наяўнасць на старонцы сэрвісу абароненага пратакола HTTPS. Перад уваходам у сістэму рэкамендуецца пераканацца ў сапраўднасці сертыфіката і сайта. Як правіла, для гэтага неабходна клікнуць у полі адраснага радка інтэрнэт (як правіла, гэта поле з піктаграмай замка або ліста паперы) і зверыць наяўную ў блоку інфармацыю. У выпадку неадпаведнасці прысутных даных з рэальнымі звесткамі аб банку варта неадкладна пакінуць такую старонку.

Трэба быць вельмі асцярожнымі падчас неабходнага наведвання сайтаў з сумніўным зместам, бо менавіта яны, як правіла, з'яўляюцца крыніцай самых новых вірусаў, дзейнасць якіх можа быць накіравана на крадзеж вашых даных (у тым ліку логінаў і пароляў). А яшчэ эксперты Нацбанка рэкамендуюць пры наяўнасці на старонцы інтэрнэт-банкінгу функцыі ўводу звестак з дапамогай віртуальнай клавіятуры заўсёды выкарыстоўваць гэтую магчымасць для абароны ад праграм «клавіятурных шпіёнаў».

Толькі ўнікальны пароль

Нельга забываць і перыядычна (а таксама ў выпадку, калі пароль стаў вядомы трэцім асобам) мяняць яго на складаны і ўнікальны. Для гэтага выкарыстоўвайце ў паролі вялікія і малыя літары, лічбы і сімвалы. Не пажадана выкарыстоўваць адзін і той жа пароль у розных сістэмах (электронная пошта, сістэмы інтэрнэт-банкінгу іншых банкаў, сацыяльныя сеткі і г. д.). Паспрабуйце пазбягаць у паролі даты свайго нараджэння, імя і іншых даступных пра вас звестак. Ні пры якіх абставінах не называйце свой пароль нікому, у тым ліку супрацоўнікам банка.

Прастата накшталт наіўнасці

У спецыялістаў фінансавай сферы ёсць свая прафесійная прыказка аб тым, што лянівы карыстальнік ДБА аднойчы абавязкова заплаціць двойчы. Што тут маецца на ўвазе? Ды проста нельга ісці насустрач пажаданням браўзера і дазваляць яму запамінаць логіны і паролі для ўваходу ў сістэмы дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання. Так, гэтая сумніўная дапамога сапраўды паскорыць ваш ўваход у сістэму, але істотна знізіць яе бяспеку.

І апошняе пра такое віртуальнае абслугоўванне: пасля заканчэння сеансу работы з сістэмай інтэрнэт-банкінгу неабходна абавязкова карэктна выходзіць з сістэмы і выкарыстоўваць толькі адпаведную опцыю.

Мабільны банкінг — не для любых смартфонаў

Гэта сёння сярод моладзі, бадай, самы папулярны метад па адначасовым выкананні пэўных аперацый і ўдзел у інтэлектуальнай гульні. Але і тут трэба дакладна разумець, што гэта не проста забава, бо грошы спісваюцца з рахункаў абсалюта рэальныя. У такім выпадку трэба ўстанаўліваць мабільныя праграмы (у тым ліку опцыі банкаў) толькі з вядомых крыніц (Google Play Market, Windows Store, App Store).

Эксперты раяць выкарыстоўваць для гэтых мэт толькі мабільныя прылады, дзе ўжо дзейнічаюць сур'ёзныя сістэмы абароны. Да іх адносяцца такія, як абмежаванне доступу да прылады, актыўнае антывіруснае праграмнае забеспячэнне з абноўленымі базамі даных і сістэма абнаўлення аперацыйнай сістэмы.

Паспрабуйце пазбягаць у паролі даты свайго нараджэння, імя і іншых даступных пра вас звестак.

Не ўстанаўлівайце мабільныя праграмы банкаў на мабільны тэлефон (прыладу), на якім атрыманы root-правы (правы суперкарыстальніка). Такія тэлефоны і прылады таксама не рэкамендуецца выкарыстоўваць для атрымання паведамленняў ад банка (напрыклад, sms з кодам (аднаразовым паролем) для праходжання аўтэнтыфікацыі). Пры страце мабільнага тэлефона, на якім ўстаноўлена мабільная праграма банка (прыходзяць sms-паведамленні з аднаразовымі паролямі пацвярджэння), або пры нечаканым спыненнем работы sim-карты варта як мага хутчэй заблакаваць такую «сімку».

І яшчэ. Ніколі не пакідайце адкрытым мабільную праграму і заўсёды карыстайцеся кнопкай для завяршэння працы.

Пра слабыя месцы электроннага кашалька

З інфармацыяй такога метаду разлікаў трэба быць увогуле закрытым. А рэкамендацыі ад Нацбанка гучаць мякчэй. Яны проста раяць захоўваць у тайне ад іншых асоб канфідэнцыйныя даныя: персанальныя — прозвішча, імя ўладальніка, нумар электроннага кашалька, пароль, які неабходна запомніць. У выпадку, калі гэта падаецца цяжкім, захоўваць яго неабходна асобна ад нумара электроннага кашалька ў наяўным выглядзе (напрыклад, перапісаўшы яго на лісток паперы сярод іншых груп лічбаў або любой іншай інфармацыі). Ніколі не паведамляйце канфідэнцыйныя звесткі іншым асобам, уключаючы сваякоў, знаёмых, работнікаў банкаў, арганізацый гандлю (сэрвісу) і прадстаўнікоў праваахоўных органаў. Не трэба перадаваць канфідэнцыйныя звесткі электроннага кашалька ні па тэлефоне, ні па электроннай пошце.

Не трэба захоўваць файлы з нумарамі электронных кашалькоў толькі на адной прыладзе, а лепш стварыць копіі на дысках, картах памяці або іншых мабільных сістэмах.

І ў гэтай сістэме эксперты раяць перыядычна мяняць свой пароль, а таксама рабіць яго максімальна складаным. Ні ў якім выпадку не трэба паведамляць, перадаваць і адпраўляць нумар электроннага кашалька і пароль ад яго ў лістах, якія прыходзяць ад імя плацежнай сістэмы з просьбай пацвердзіць прыналежнасць кашалька вам. Пры магчымасці лепш і тут выкарыстоўваць віртуальную клавіятуру на экране для ўводу пароля.

У сваім пакрокавым дапаможніку Нацбанк нагадвае нам, што не трэба захоўваць файлы з нумарамі электронных кашалькоў толькі на адной прыладзе, а лепш стварыць копіі на дысках, картах памяці або іншых мабільных сістэмах. Пажадана, каб такія прылады не мелі падлучэння інтэрнэту. Пажадана таксама ўсталяваць на свае прылады ліцэнзійнае праграмнае забеспячэнне, у тым ліку антывіруснае і фаервол, і рэгулярна ажыццяўляць іх абнаўленне.

Непасрэдна перад аплатай тавараў (работ, паслуг) электроннымі грашыма паспрабуйце праверыць надзейнасць і рэпутацыю прадаўца. Апошняя рэкамендацыя рэгулятара тычыцца нашай уважлівасці: каб карыстальнікі не пакідалі адкрытай праграму, якая забяспечвае доступ да электроннага кашалька, а пасля выканання той ці іншай плацежнай аперацыі карэктна выходзілі з яе і пры гэтым выкарыстоўвалі адпаведную опцыю ў меню праграмы. Вось і ўся азбука нашага «безнаяўнага» жыцця. Цяпер засталося ўсё гэта запомніць і выкарыстоўваць на практыцы. Удачы.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

ДАРЭЧЫ

«ПЛАСТЫКАВЫХ» МАХЛЯРОЎ ПАЧНУЦЬ ЛАВІЦЬ «ЗА РУКУ»

Спецыялісты акцыянернага таварыства «Банкаўскі працэсінгавы цэнтр» упэўнены, што цяпер падобных фінансавых злодзеяў могуць лавіць «пачкамі», бо ў краіне пачала дзейнічаць праграма па спыненні махлярства з банкаўскімі карткамі ў момант аўтарызацыі.

Адпаведны праграмны модуль Fraud Prevention быў укаранёны цэнтрам яшчэ 1 чэрвеня. «Ён дазваляе апярэджваць дзеянні ашуканцаў, перарываючы спробы здзяйснення махлярскіх аперацый з выкарыстаннем банкаўскіх картак на самай ранняй стадыі — у момант аўтарызацыі», — растлумачылі ў працэсінгавым цэнтры. Эксперты падкрэслілі, што новае тэхналагічнае рашэнне забяспечвае правядзенне анлайн-аналізу і ажыццяўленне адмовы ў аўтарызацыі непасрэдна ў момант яе правядзення для тых аперацый, узровень небяспекі якіх перавышае дапушчальны. Выкарыстанне працэсінгавым цэнтрам новага эфектыўнага інструмента ў барацьбе з ашуканскімі аперацыямі дазволіць знізіць рызыку ўзнікнення страт ад такіх аперацый і зрабіць разлікі па банкаўскіх картках і ў эквайрынгавай сетцы банкаў, якія карыстаюцца паслугамі цэнтра, больш бяспечнымі.

Заўважу, што Банкаўскі працэсінгавы цэнтр сёння з'яўляецца найбуйнейшым прадпрыемствам у Беларусі па абслугоўванні тэрмінальнага абсталявання, якое ўстаноўлена ў арганізацыях гандлю і сэрвісу для разлікаў з выкарыстаннем банкаўскіх картак.

БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ

ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ ДЛЯ ПОЛУЧЕНИЯ ПОСЛЕВУЗОВСКОГО ОБРАЗОВАНИЯ В АСПИРАНТУРЕ (ДНЕВНОЙ, ЗАОЧНОЙ И В ФОРМЕ СОИСКАТЕЛЬСТВА) И ДОКТОРАНТУРЕ (ДНЕВНОЙ И В ФОРМЕ СОИСКАТЕЛЬСТВА)

УНП 100235722

Лица, поступающие в аспирантуру для обучения в дневной или заочной форме получения образования, сдают вступительный экзамен по специальной дисциплине в объеме учебной программы I ступени высшего образования. Кандидатские экзамены и зачет по общеобразовательным дисциплинам должны быть сданы до поступления в аспирантуру.

Лица, поступающие в аспирантуру для обучения в заочной форме получения образования и в форме соискательства, должны иметь опыт практической работы не менее двух лет на должностях, требующих наличия высшего образования.
Для получения послевузовского образования в аспирантуре в форме соискательства сдача вступительного экзамена не требуется. Наличие сданных кандидатских экзаменов по общеобразовательным дисциплинам не обязательно.

Подробная информация по правилам приема на сайтах БГУ (http://www.research. bsu.by; http://www.bsu.by) или по телефонам: 209-51-73, 209-50-24.

Прием документов осуществляется с 1 августа по 30 сентября 2016 года по адресу: г. Минск, ул. Бобруйская, 9, к. 414, отдел аспирантуры и докторантуры.

План приема лиц для получения послевузовского образования за счет средств республиканского бюджета на 2016 год в Белорусском государственном университете

Организация-заказчик	Шифр специальности	Аспирантура				Докторантура		
		Всего	Из них по форме получения образования			Всего	Из них по форме получения образования	
			Дневная	Заочная	Соискательство		Дневная	Соискательство
1	2	3	4	5	6	7	8	9
Организация-исполнитель	01.01.01	2	2			0		
Организация-исполнитель	01.01.02	1	1			0		
Организация-исполнитель	01.01.05	2	2			0		
Организация-исполнитель	01.01.06	1	1			0		
Организация-исполнитель	01.01.09	1	1			0		
Организация-исполнитель	01.02.04	1	1			0		
Организация-исполнитель	01.02.05	1	1			0		
Организация-исполнитель	01.02.08	2	1	1		0		
Организация-исполнитель	01.04.02	1	1			0		
Организация-исполнитель	01.04.03	2	2					
Организация-исполнитель	01.04.04	1	1			0		
Организация-исполнитель	01.04.05	3	3			0		
Организация-исполнитель	01.04.07	3	3			0		
Организация-исполнитель	01.04.10	0				1	1	
Организация-исполнитель	01.04.16	2	2			0		
Организация-исполнитель	01.04.21	1	1			0		
Организация-исполнитель	02.00.01	5	5			0		
Организация-исполнитель	02.00.02	3	3			0		
УО «Могилевский государственный университет продовольствия»	02.00.02	0				1	1	
РПУП «АКАДЕМФАРМ», НАН Беларуси	02.00.02	1			1			
Организация-исполнитель	03.01.02	3	3			0		
ГУ «Республиканский научно-практический центр неврологии и нейрохирургии», Минздрав	03.01.04	1			1	0		
Организация-исполнитель	03.01.05	1	1			0		
Организация-исполнитель	03.01.06	1			1			
Организация-исполнитель	03.01.07	0				1	1	
ГУ «Научно-практический центр государственного комитета судебных экспертиз Республики Беларусь», Государственный комитет судебных экспертиз РБ	03.01.07	1			1	0		
Организация-исполнитель	03.02.07	1	1			0		
Организация-исполнитель	03.02.08	1		1		0		
НИУ «Институт прикладных физических проблем имени А.Н. Севченко» БГУ	05.13.01	1			1	0		
Организация-исполнитель	05.13.01	2	2			0		
Организация-исполнитель	05.13.17	1	1					
НИУ «Институт ядерных проблем» БГУ	05.13.18	0				1	1	
Организация-исполнитель	05.13.19	3	3			0		
Организация-исполнитель	05.25.02	1			1	0		
Национальный архив Республики Беларусь, Минюст	05.25.02	1			1	0		
Организация-исполнитель	07.00.02	7	6		1	2	1	1
ГУО «Республиканский институт высшей школы» БГУ	07.00.02	0				1	1	
ГУ «Республиканская научная медицинская библиотека», Минздрав	07.00.02	1			1	0		
Отдел образования спорта и туризма Администрации Советского района г. Гомеля	07.00.02	1	1			0		
Организация-исполнитель	07.00.03	5	5			0		
ГУО «Средняя школа № 44 имени Якуба Коласа г. Минска»	07.00.03	1	1			0		
ООО «Мебельные компоненты», Мингорисполком	07.00.03	1			1	0		
ГУО «Средняя школа № 13 г. Жлобина»	07.00.03	1	1			0		
Организация-исполнитель	07.00.06	1	1			0		
Организация-исполнитель	07.00.07	1			1	0		
УО «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы»	07.00.09	0				1	1	
Организация-исполнитель	07.00.09	1	1			0		
Организация-исполнитель	07.00.15	3	2	1		0		
Организация-исполнитель	08.00.01	2	1	1		0		
ГУО «Институт бизнеса и менеджмента технологий» БГУ	08.00.05	1			1	0		
ИООО «Газпромнефть-Белнефтепродукт», Мингорисполком	08.00.05	1			1	0		
ООО «ПолиРун-строй», Мингорисполком	08.00.05	1			1	0		
ЗАО «МОДИС-М», Мингорисполком	08.00.05	1			1	0		
Организация-исполнитель	08.00.05	10	4	4	2	0		
ЧУП «Ствига», Мингорисполком	08.00.05	1			1	0		
Организация-исполнитель	08.00.13	3	1	1	1	0		
Организация-исполнитель	08.00.14	5	5			0		
Минская региональная таможня, Государственный таможенный комитет РБ	08.00.14	1			1	0		
Организация-исполнитель	09.00.03	1	1			1		1
УО «Белорусский государственный медицинский университет», Минздрав	09.00.03	0				1		1
УО «Полоцкий государственный университет»	09.00.03	0				1		1
Организация-исполнитель	09.00.08	1			1	0		
Организация-исполнитель	09.00.11	1	1			1		1
УО «Полоцкий государственный университет»	09.00.14	0				1	1	
ГУО «Гимназия № 2 г. Витебска»	10.01.01	1	1			0		
Организация-исполнитель	10.01.01	1	1			0		
УО «Полоцкий государственный университет»	10.01.01	0				1		1
Полоцкий колледж УО «Витебский государственный университет имени П.М. Машерова»	10.01.02	1		1		0		
Организация-исполнитель	10.01.03	2	2			0		
УО «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы»	10.01.10	1	1			0		
Организация-исполнитель	10.01.10	9	9			2	2	
ГУ «Научно-исследовательский институт Вооруженных Сил Республики Беларусь», Минобороны	10.01.10	0				1		1
УО «Полоцкий государственный аграрно-экономический колледж», Минсельхозпрод	10.02.01	1		1		0		
Организация-исполнитель	10.02.02	1		1		0		
УО «Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники»	10.02.19	1		1		0		
УО «Международный государственный экологический институт имени А.Д.Сахарова» БГУ	10.02.19	1			1	0		
УО «Витебский государственный университет имени П.М. Машерова»	10.02.19	0				1	1	
Организация-исполнитель	10.02.19	4	4			0		
УО «Белорусский государственный аграрный технический университет», Минсельхозпрод	10.02.19	1			1	0		
ГУО «Средняя школа № 4 «г. Барановичи»	10.02.19	1	1			0		
ИПУП «АйЭйчЭсГлобал», Мингорисполком	10.02.21	1			1	0		
Организация-исполнитель	12.00.01	1	1			0		
Военный факультет БГУ, Минобороны	12.00.01	1			1	0		
УО «Могилевский институт Министерства внутренних дел Республики Беларусь», МВД	12.00.01	0				1		1
Организация-исполнитель	12.00.02	2		2		0		
Организация-исполнитель	12.00.03	0				1		1
Управление образования спорта и туризма Администрация Заводского района г. Минска	12.00.03	1		1		0		
Белорусская государственная орденов Октябрьской Революции и Трудового Красного Знамени сельскохозяйственная академия, Минсельхозпрод	12.00.03	1			1			
ООО «Юридическая компания «Веда Консалтинг», Мингорисполком	12.00.03	1			1	0		
УО «Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова»	12.00.06	1	1			0		
Организация-исполнитель	12.00.08	1	1			0		
УО «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина»	12.00.08	1			1	0		
Министерство иностранных дел Республики Беларусь	12.00.10	0				1		1
Организация-исполнитель	12.00.10	1	1			2	1	1
Приход храма в честь Собора Всех Белорусских Святых г. Гродно, Белорусская православная церковь	12.00.10	1			1	0		
УО «Полоцкий государственный университет»	12.00.11	1	1			0		
УО «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы»	12.00.12	0				1	1	
Организация-исполнитель	12.00.12	1			1	1		1
Государственный пограничный комитет Республики Беларусь	12.00.14	1			1	0		
Организация-исполнитель	12.00.14	2		2		0		
УО «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы»	12.00.15	1		1		0		
Организация-исполнитель	12.00.15	1	1			1	1	
ГУО «Гимназия № 31 г. Минска»	13.00.01	1			1	0		
Организация-исполнитель	13.00.04	1			1	0		
ГУ «Республиканский госпиталь Департамента финансов и тыла Министерства внутренних дел Республики Беларусь», МВД	13.00.04	1	1					
Организация-исполнитель	19.00.01	1		1		0		
ООО «Де Визу», Мингорисполком	19.00.01	1	1			0		
Организация-исполнитель	19.00.04	1	1			0		
Организация-исполнитель	19.00.05	2		1	1	0		
УО «Военная Академия Республики Беларусь», Минобороны	19.00.05	1		1		0		
УО «Мозырский государственный педагогический университет имени И.П. Шамякина»	19.00.05	1	1			0		
ГУО «Республиканский институт высшей школы» БГУ	19.00.07	0				1	1	
Организация-исполнитель	22.00.01	4	1		3	0		
УО «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы»	22.00.01	1	1			0		
Организация-исполнитель	22.00.08	2	1		1	0		
Управление по г. Минску и Минской области Комитета государственной безопасности Республики Беларусь, КГБ	22.00.08	1			1	0		
ГУО «Институт бизнеса и менеджмента технологий» БГУ	22.00.08	1			1	0		
АО «Центр развития экономики» (Российская Федерация) в Республике Беларусь, Мингорисполком	22.00.08	1			1	0		
Организация-исполнитель	23.00.01	1	1			1		1
Организация-исполнитель	23.00.02	3	3			0		
Организация-исполнитель	24.00.01	4	3		1	1		1
ООО «Хомо Туристус», Мингорисполком	24.00.01	1	1			0		
РОО «Белорусская ассоциация клубов ЮНЕСКО»	24.00.01	1	1			0		
Организация-исполнитель	24.00.03	1			1	0		
Организация-исполнитель	25.01.01	1			1	0		
УО «Витебский государственный университет имени П.М. Машерова»	25.03.01	1		1		0		
УО «Полесский государственный университет»	25.03.02	1	1			0		
Организация-исполнитель	25.03.02	1	1			1	1	
ГПУ «Национальный парк «Нарочанский», Управление делами Президента Республики Беларусь	25.03.10	1			1			
Организация-исполнитель	25.03.10	3	1		2	0		
ИТОГО:		**187**	**117**	**23**	**47**	**30**	**16**	**14**

Учреждение образования
«Брестский государственный технический университет»

ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ НА ДНЕВНУЮ И ЗАОЧНУЮ ФОРМЫ ПОЛУЧЕНИЯ ОБРАЗОВАНИЯ НА ОБУЧЕНИЕ ЗА СЧЕТ СРЕДСТВ РЕСПУБЛИКАНСКОГО БЮДЖЕТА на 2016 год,

установленные приказом Государственного комитета по науке и технологиям Республики Беларусь от 9 июня 2016 г. № 104,

по следующим отраслям науки и специальностям

Отрасль науки	Шифр и наименование специальности	Форма получения образования	Количество мест
Технические науки	05.13.15 – Вычислительные машины, комплексы и компьютерные сети	дневная	2
	05.23.01 – Строительные конструкции, здания и сооружения	дневная заочная	1 1
	05.23.04 – Водоснабжение, канализация, строительные системы охраны водных ресурсов	дневная	1
	05.23.05 – Строительные материалы и изделия	дневная	3
Экономические науки	08.00.05 – Экономика и управление народным хозяйством	дневная заочная	2 1
Науки о земле	25.03.13 – Геоэкология	соискательство	1

Также осуществляется прием в аспирантуру на дневную и заочную формы получения образования, а также в форме соискательства на обучение за счет средств юридических и физических лиц по следующим научным специальностям:

01.00.00	**Физико-математические науки**
01.02.04	Механика деформируемого твердого тела
01.04.14	Теплофизика и теоретическая теплотехника
05.00.00	**Технические науки**
05.02.02	Машиноведение, системы приводов и детали машин
05.02.04	Трение и износ в машинах
05.13.15	Вычислительные машины, комплексы и компьютерные сети
05.14.04	Промышленная теплоэнергетика
05.23.01	Строительные конструкции, здания и сооружения
05.23.02	Основания и фундаменты, подземные сооружения
05.23.04	Водоснабжение, канализация, строительные системы охраны водных ресурсов
05.23.05	Строительные материалы и изделия
05.23.08	Технология и организация строительства
05.23.17	Строительная механика
08.00.00	**Экономические науки**
08.00.05	Экономика и управление народным хозяйством
25.00.00	**Науки о земле**
25.03.13	Геоэкология

Срок обучения: дневная форма – до 3 лет, заочная – до 4 лет, соискательство – до 5 лет. Прием документов для поступления в аспирантуру с 1 августа по 30 сентября 2016 года. Вступительные экзамены проводятся с 10 октября по 20 октября 2016 года.

Документы принимаются по адресу:
224017, г. Брест, ул. Московская, 267, БрГТУ, аспирантура (каб. 5/109),
телефон для справок: 42-26-45.

Дополнительная информация на сайте: www.bstu.by. УНП 200002511

Учреждение образования
«БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ИНФОРМАТИКИ И РАДИОЭЛЕКТРОНИКИ»

ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ БГУИР в 2016 году НА БЮДЖЕТНУЮ ФОРМУ ОБУЧЕНИЯ

по следующим специальностям:

Шифр и название специальностей	Дневная форма обучения	Заочная форма обучения	Соискательство
АСПИРАНТУРА			
01.04.03 Радиофизика	-	-	-
01.04.04 Физическая электроника	1	-	-
01.04.05 Оптика	-	-	-
01.04.07 Физика конденсированного состояния	1	-	-
05.09.05 Теоретическая электротехника	-	-	-
05.11.08 Радиоизмерительные приборы	1	-	-
05.11.15 Метрология и метрологическое обеспечение	-	-	-
05.11.17 Приборы, системы и изделия медицинского назначения	-	1	-
05.12.04 Радиотехника, в том числе системы и устройства телевидения	2	-	-
05.12.07 Антенны, СВЧ устройства и их технологии	-	-	-
05.12.13 Системы, сети и устройства телекоммуникаций	1	-	-
05.12.14 Радиолокация и радионавигация	-	-	-
05.13.01 Системный анализ, управление и обработка информации	-	2	1
05.13.05 Элементы и устройства вычислительной техники и систем управления	2	-	-
05.13.06 Автоматизация и управление технологическими процессами и производствами	1	-	-
05.13.10 Управление в социальных и экономических системах (технические науки)	-	-	-
05.13.11 Математическое и программное обеспечение вычислительных машин, комплексов и компьютерных сетей	2	-	-
05.13.12 Системы автоматизации проектирования	-	-	-
05.13.15 Вычислительные машины, комплексы и компьютерные сети	-	-	-
05.13.17 Теоретические основы информатики	1	-	-
05.13.18 Математическое моделирование, численные методы и комплексы программ	2	-	-
05.13.19 Методы и системы защиты информации, информационная безопасность	4	1	1
05.16.08 Нанотехнологии и наноматериалы (в электронике) – (физико-математические и технические науки)	3	-	-
05.26.01 Охрана труда	-	1	-
05.26.02 Безопасность в чрезвычайных ситуациях	-	-	-
05.27.01 Твердотельная электроника, радиоэлектронные компоненты, микро и наноэлектроника, приборы на квантовых эффектах	6	-	-
05.27.06 Технология и оборудование для производства полупроводников, материалов и приборов электронной техники	1	-	-
08.00.05 Экономика и управление народным хозяйством	-	-	1
08.00.13 Математические и инструментальные методы экономики	-	-	1
19.00.03 Психология труда, инженерная психология, эргономика (технические науки)	2	-	1
ИТОГО:	**30**	**5**	**5**

Лица, поступающие в аспирантуру на конкурсной основе, должны иметь:
- высшее образование;
- склонность к научным исследованиям, что подтверждается научными публикациями, участием в научно-исследовательских и инновационных проектах, конференциях или другими материалами;
- рекомендацию ученого совета учреждения высшего образования или факультета этого учреждения (для поступающих в год окончания обучения в данном учреждении) либо опыт практической работы не менее двух лет на должностях, требующих наличия высшего образования;
- удостоверение о сдаче кандидатских экзаменов и зачетов по общеобразовательным дисциплинам.

Лица, поступающие в аспирантуру для обучения в дневной или заочной форме получения образования, сдают вступительный экзамен по специальной дисциплине в объеме учебной программы I ступени высшего образования.

Лица, не прошедшие по конкурсу на обучение за счет средств республиканского бюджета, получившие на вступительном экзамене оценку не ниже чем «четыре», имеют право участвовать в конкурсе на обучение в аспирантуре на платной основе.

Срок обучения в аспирантуре не должен превышать по дневной форме – 3 года, по заочной – 4 года, в форме соискательства – 5 лет.

Адрес: 220013, г. Минск, ул. П. Бровки, д. 4, 2-й уч. корпус, ауд. 410.
Телефоны для справок: 293-21-06; 293-23-34, e-mail: otdaspir@bsuir.by

УНП 100347005

Научно-практический центр проблем укрепления законности и правопорядка Генеральной прокуратуры Республики Беларусь

(г. Минск, ул. Захарова, 76)

ОБЪЯВЛЯЕТ НАБОР В ДОКТОРАНТУРУ в 2016 г. по специальностям:

12.00.08 – уголовное право и криминология; уголовно-исполнительное право (1 место);
12.00.09 – уголовный процесс (1 место);
12.00.11 – судебная деятельность; прокурорская деятельность, правозащитная и правоохранительная деятельность (1 место);
12.00.12 – криминалистика; судебно-экспертная деятельность; оперативно-розыскная деятельность (1 место).

Форма обучения: соискательство (внебюджет).
Дополнительная информация по т./ф. 294 78 80.

УНП 190759862

Учреждение образования «Белорусская государственная орденов Октябрьской Революции и Трудового Красного Знамени сельскохозяйственная академия»

ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ В 2016 ГОДУ

ОЧНАЯ ФОРМА ОБУЧЕНИЯ ПО СПЕЦИАЛЬНОСТЯМ: **Чел.**
- Технологии и средства механизации сельского хозяйства 2
- Агропочвоведение, агрофизика 1
- Геодезия 1
- Мелиорация рекультивация и охрана земель 1
- Селекция и семеноводство сельскохозяйственных растений 1
- Защита растений 2
- Частная зоотехния, технология производства продуктов животноводства 1
- Экономика и управление народным хозяйством 5

ЗАОЧНАЯ ФОРМА ОБУЧЕНИЯ ПО СПЕЦИАЛЬНОСТЯМ:
- Рыбное хозяйство и аквакультура 1
- Технологии и средства механизации сельского хозяйства 1
- Экономика и управление народным хозяйством 2

ДОКТОРАНТУРА ПО СПЕЦИАЛЬНОСТЯМ:
- Агрохимия 1
- Селекция и семеноводство сельскохозяйственных растений 1

В аспирантуру на конкурсной основе принимаются лица, имеющие высшее образование, склонность к научным исследованиям; рекомендацию совета факультета (для поступающих в год окончания обучения в данном учреждении) либо опыт практической работы не менее двух лет на должностях, требующих наличия высшего образования.

Поступающие в аспирантуру для получения научной квалификации «Исследователь» должны сдать кандидатские экзамены и зачеты по общеобразовательным дисциплинам до поступления в аспирантуру.

Для поступления в аспирантуру необходимо подать:
1. Заявление на имя ректора академии по установленной форме.
2. Личный листок по учету кадров.
3. Автобиография.
4. Копии диплома о высшем образовании и прилагаемой к нему выписки из зачетно-экзаменационной ведомости.
5. Копии диплома магистра и прилагаемой к нему выписки из зачетно-экзаменационной ведомости (при наличии).
6. Копия удостоверения о сдаче кандидатских экзаменов и зачетов по общеобразовательным дисциплинам.
7. Копия трудовой книжки или рекомендация совета факультета учреждения образования (для поступающих в год окончания обучения в данном учреждении).
8. Список и копии опубликованных научных работ, а при их отсутствии – научный реферат по профилю избранной специальности.
9. Три фотографии размером 4х6 см.
10. Медицинская справка о состоянии здоровья по форме, установленной Министерством здравоохранения.

Паспорт и подлинники дипломов предъявляются лично.

ПРИЕМ ДОКУМЕНТОВ с 1 августа по 30 сентября 2016 года.

Поступающие в аспирантуру сдают вступительный экзамен по специальной дисциплине в объеме действующей программы для студентов вузов.

Прием вступительного экзамена с 15 по 18 октября 2016 года.

Наш адрес: 213407, Аспирантура БГСХА, ул. Мичурина, 5, ауд. 434, г. Горки, Могилевская область, тел. 79659.

УНП 700077852

УНП 100354659

Учреждение образования
«Белорусский государственный технологический университет»

ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ И ДОКТОРАНТУРУ В 2016 ГОДУ НА ОБУЧЕНИЕ ПО ДНЕВНОЙ, ЗАОЧНОЙ И В ФОРМЕ СОИСКАТЕЛЬСТВА

Прием документов с 1 августа по 30 сентября по адресу: г. Минск, ул. Свердлова, 13А, к. 237, тел. 8 017 327 38 92 (http://www.belstu.by)

План приема лиц для получения послевузовского образования за счет средств республиканского бюджета на 2016 год учреждения образования «Белорусский государственный технологический университет»

№ п/п	Организация-исполнитель	Организация-заказчик	Сторонний заказчик	Отрасль науки	Шифр специальности	Аспирантура				Докторантура		
						всего	из них по форме получения образования			всего	из них по форме получения образования	
							дневная	заочная	соискательство		дневная	соискательство
1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12	13
1	Белорусский государственный технологический университет	*Организация-исполнитель*		01.00.00	01.04.02	1	1					
		Организация-исполнитель			01.04.14	1	1					
		Организация-исполнитель		02.00.02	02.00.03	1	1					
		Организация-исполнитель			02.00.05	3	3					
		Организация-исполнитель		03.00.00	03.01.06	1	1					
		СП ООО «Фармленд» Миноблисполком		05.00.00	03.01.06	1		1				
		Организация-исполнитель			05.02.13	2	2					
		Организация-исполнитель			05.17.01	1	1					
		Государственный комитет судебных экспертиз			05.17.04	1			1			
		Организация-исполнитель			05.17.06					2		2
		Организация-исполнитель			05.17.11	2	2					
		Организация-исполнитель			05.21.01	1	1					
		Организация-исполнитель			05.21.05	1	1					
		Организация-исполнитель			05.25.05	1			1			
		Организация-исполнитель		05.16.00	05.16.09					1		1
		Организация-исполнитель		25.00.00	25.03.13	1	1					
		Организация-исполнитель		08.00.00	08.00.05	3	2	1		1		1
		Барановичский государственный университет			08.00.05	1	1					
		Организация-исполнитель		06.00.00	06.01.07					1		1
		ГПУ «Национальный парк «Припятский»			06.03.01	1		1				
		Организация-исполнитель			06.03.02					1		1
					ИТОГО	**23**	**18**	**3**	**2**	**6**		**6**

Учреждение образования «Витебский государственный технологический университет»

ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ В 2016 ГОДУ

в соответствии с контрольными цифрами приема для получения послевузовского образования за счет средств республиканского бюджета по следующим специальностям:

Шифр и наименование специальности	Аспирантура		
	Всего	Из них по форме получения образования	
		дневная	заочная
05.02.08 – Технология машиностроения	2	1	1
05.13.06 – Автоматизация и управление технологическими процессами и производствами (легкая промышленность)	1	1	-
05.19.02 – Технология и первичная обработка текстильных материалов и сырья	4	4	-
ВСЕГО	**7**	**6**	**1**

Также осуществляется прием в докторантуру по специальности 05.19.02 – Технология и первичная обработка текстильных материалов и сырья и аспирантуру за счет средств юридических и физических лиц.

Документы для поступления принимаются с 01 августа по 30 сентября 2016 года.

Полную информацию можно получить по адресу: 210035, г. Витебск, Московский пр-т, 72, аспирантура, тел. 8 (0212) 47 76 45.
Подробности на сайте: www.vstu.vitebsk.by.

УНП 300031282.

Сумесны праект газеты «Звязда» і Міністэрства ўнутраных спраў

ФАРПОСТ СПАКОЮ

№ 7 (25)

«ЛІЦЭЙ — НАШ ДРУГІ ДОМ»

Больш як пяцьдзясят юнакоў сталі першымі выпускнікамі спецыялізаванага ліцэя Міністэрства ўнутраных спраў

Стары будынак, што на вуліцы Стаханаўскай у Мінску, гэтыя хлопцы наўрад ці забудуць. За апошнія некалькі гадоў яны сталі сапраўднымі сябрамі. Як салдаты ў казармах, клаліся спаць і падымаліся ў адзін час, разам хадзілі ў сталоўку і на заняткі. А цяпер для іх адкрываецца будучыня, якую многія з іх вырашылі звязаць з міліцыяй. У апошні ліцэйскі дзень у музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны дыпломы ім уручыў міністр унутраных спраў Ігар Шуневіч. Пасля іх чакала экскурсія і выпускны ў роднай навучальнай установе.

Фота Надзеі БУКАН.

— Выпуск атрымаўся моцным, — кажа Уладзімір Віткоўскі, начальнік ліцэя, з якім атрымалася сустрэцца і пагутарыць літаральна за гадзіну да выпускнога. — Сёлета мы выпусцілі 55 курсантаў. З іх 43 захацелі служыць у інтарэсах нацыянальнай бяспекі. 23 хлопцы паступаюць у Акадэмію МУС, 12 — у Ваенную акадэмію. Дзеці даволі таленавітыя. Могуць лёгка ўдзельнічаць у розных конкурсах. Нават у самадзейнасці. Малайцы, адным словам.

— Якая галоўная адметнасць вашага ліцэя?

— У нас вучацца выключна хлопчыкі. 24 гадзіны ў суткі пад нашым наглядам. Ліцэісты знаходзяцца на поўным забеспячэнні: два сняданкі, абед, вячэра, час на асабістыя справы. У 22:00 у нас адбой. Навучальны працэс вельмі падобны да таго, які арганізаваны ў суворaўскім вучылішчы. З першага верасня ў нас нават форма будзе падобная. Мы не адмаўляем, што перанялі пэўныя напрацоўкі ў суворaўскага. Усё ж такі гэтай навучальнай установе больш за шэсцьдзясят гадоў. А наш ліцэй быў створаны ў 2015-м на базе Мінскага кадэцкага вучылішча імя Міхаіла Фрунзэ. Нягледзячы на гэта, мы імкнёмся ісці з суворaўскім вучылішчам нага ў нагу на ўсіх спаборніцтвах, алімпіядах.

— Вам прыходзілася каго-небудзь адлічваць з ліцэя?

— Ад нас сышлі адзінкі. Пытанні ўзнікаюць з-за дысцыпліны. Усё ж такі вучацца ў нас нядрэнна.

Калі завяршаем нашу размову з Уладзімірам Віткоўскім, на пляцоўцы каля ўвахода ўжо збіраюцца выпускнікі. Нехта фатаграфуецца на памяць, а хтосьці размаўляе з бацькамі, сябрамі і прыгадвае час, праведзены ў ліцэі.

— Ведаеце, тут усё адрозніваецца ад звычайнай школы, — заўважае выпускнік Аляксей Астрэйка, які збіраецца паступаць у Акадэмію МУС. — Мы жылі разам, праходзілі страявую падрыхтоўку. Тут дысцыпліна на іншым узроўні. І мне падаецца, што ў нас вучыцца цікавей, чым у школе. Я, безумоўна, сумую, што пакідаю ліцэй. Яго атмасферы нам будзе не хапаць. Мы прызвычаіліся адзін да аднаго. Я ганаруся, што вучыўся менавіта тут. Ліцэй — наш другі дом. Буду старацца прыязджаць сюды і пасля заканчэння.

Сяргей Бабіч з Жодзіна, бацька выпускніка, прызнаецца, што свайго сына нават адгаворваў ад паступлення ў ліцэй. Маўляў, навошта табе гэтыя казармы. Аднак хлопец настаяў на сваім.

— Мы былі задаволеныя, што ён пайшоў сюды вучыцца. Розніца пачала ў ім заўважацца ўжо праз некалькі месяцаў. Адчувалася складнасць, дарослась у развагах. Многія бацькі здзіўляліся, цікавіліся, навошта вы туды адправілі сына, а праз некаторы час казалі супрацьлеглае. Сын змяніўся ў лепшы бок. Цяпер збіраецца паступаць у Ваенную акадэмію.

Праз колькі хвілін усе размовы сціхлі. На пляцоўцы запанавала цішыня. Курсанты, маршыруючы, прайшлі перад бацькамі і сваімі выкладчыкамі, а пасля кінулі ў паветра дзясяткі бліскучых манетак. На шчасце.

Афіцэры будучыні

Урачысты выпуск афіцэраў Акадэміі МУС сёлета прайшоў на плошчы Дзяржаўнага сцяга. Доўгачаканыя пагоны і дыпломы аб вышэйшай адукацыі сёлета атрымалі 382 навучэнцы акадэміі. 28 чалавек скончылі вучобу на выдатна. Як паведамілі ва Упраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, сярод выпускнікоў — маладыя афіцэры міністэрстваў абароны і ўнутраных спраў, следчага камітэта, дэпартамента фінансавых расследаванняў камітэта дзяржкантролю, дзяржаўнага камітэта крымінальных экспертыз і іншых сілавых структур. Ігар Шуневіч пажадаў выпускнікам ініцыятывы, смеласці пры выкананні задач, адданасці канстытуцыі і прысязе.

ра. Выдаём хлопцам форму. Калі маюць высокія балы па прадметах, могуць паступаць у Акадэмію МУС без іспытаў. Зараз у нас будзе адбор, уступная кампанія. Новыя курсанты будуць вучыцца ў ліцэі пяць гадоў. На 100 месцаў ужо прэтэндуюць больш як 400 чалавек. Па 50 курсантаў мы залічылі ў сёмы і восьмы класы.

— Калі не памыляюся, у ліцэі выкладаюць прадметы, якіх няма ў вучэбнай праграме звычайнай сярэдняй школы.

— У нас у тым ліку выкладаюць медыцынскую і страявую падрыхтоўку, асновы права, рэлігіязнаўства, этыкет, харэаграфію...Такія дысцыпліны сапраўды ёсць не ва ўсіх школах. Мы ж рыхтуем будучых афіцэраў. Ні за аднаго курсанта не сорамна. Кожнага з іх можна прызначыць малодшым камандзірам у любой навучальнай установе, куды яны будуць паступаць.

— Цікава, а які распарадак у вашым ліцэі?

— Пад'ём у 7:00. Пасля — зарадка, умываннe, сняданак. Потым пачынаюцца заняткі, якія заканчваюцца ў 15:30. Далей — самападрыхтоўка,

■ На пасту

ТРЫМАЛІ ЦЯЖКІ ЛІХТАР І РАТАВАЛІ МУЖЧЫНУ НА ПАЖАРЫ

Служба міліцыянера бывае настолькі непрадказальнай, што даволі часта людзям у пагонах даводзіцца выконваць няпрофільныя задачы. У мінулым выпуску «Фарпоста» мы расказвалі пра супрацоўніка Дэпартамента аховы Уладзіслава Базоўскага, які на пэўны час ператварыўся ў сапраўднага ратавальніка і кінуўся з вады выцягваць жанчыну. Мы вырашылі працягнуць тэму смеласці на нашых старонках, і ў гэтым нумары друкуем яшчэ некалькі гісторый пра людзей, якіх варта называць сапраўднымі міліцыянерамі.

Фестываль нацыянальных культур, які штогод праходзіць у Гродне, збірае шмат людзей. Адным ёсць што паказаць, другім — на што паглядзець. Гэтым разам у старажытным горадзе зноў было шматлюдна, цікава, разнастайна. На шчасце, адбылося ўсё без эксцэсаў. Але быў адзін момант, які мог сапсаваць літаральна ўсё свята.

Як перадае ўпраўленне ўнутраных спраў Гродзенскага аблвыканкама, маёр міліцыі Сяргей Мулярчык і малодшы лейтэнант Марк Юхневіч (на фота) падчас фестывалю неслі службу на вуліцы Савецкай. У той дзень у масавых мерапрыемствах прынялі ўдзел 120 тысяч чалавек! І вельмі шмат з іх адпачывалі менавіта на Савецкай. Усё было добра, як раптам да мужчын у форме нечакана падбегла жанчына і паведаміла, што насупраць універмага на людзей падае... ліхтарны слуп. Праваахоўнікі пайшлі на месца магчымага здарэння і неўзабаве канстатавалі, што ў слупа зламалася аснова. Міліцыянеры папрасілі людзей адысці падалей, дапамаглі гандлярам перанесці сталы з таварам і вырашылі ўтрымліваць канструкцыю, якая пры гэтым яшчэ і гайдалася. Праваахоўнікі звязаліся з начальствам. Да ўніверсмага падышоў Вячаслаў Баклага, начальнік упраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі Гродзенскага аблвыканкама. Ён і паведаміў аб тым, што здарылася, камунальнікам. Да праблемнага слупа прыбылі яшчэ два міліцыянеры — Віталь Зязюлевіч і Павел Хамылёў. З-за вялікай колькасці людзей тэхніка аператыўна прыехаць не змагла. І ўвесь гэты час, паўтары гадзіны, міліцыянерам прыйшлося трымаць слуп. Часам і такое здараецца. Галоўнае, што ніхто не пацярпеў.

***

А вось удзельнікам наступнай гісторыі магло пашанцаваць менш. Інцыдэнт, як адзначылі ў УУС Мінаблвыканкама, мог каштаваць жыцця маленькаму дзіцяці.

Ігар Пазнякоў, старшы оперупаўнаважаны па асабліўых справах аддзела па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Барысаўскага РУУС, па службовых абавязках знаходзіўся на вуліцы Чапаева. На даху крамы, якая прымыкала да жылога дома, ён заўважыў... малога. Дзіця нічога не баялася, поўзала па краі даху. Міліцыянер палічыў, што малы мог трапіць на дах праз адкрытае акно і кінуўся ў пад'езд. Дзверы адной з кватэр на другім паверсе адчыніла жанчына і, калі пачула пра дзіця, абамлела. Пазнякоў пабег да акна, пералез на дах крамы і ўжо неўзабаве трымаў на сваіх руках малога. Як аказалася пазней, хлопчык самастойна ўскараскаўся на падаконнік, а пасля апынуўся на незнаёмай тэрыторыі. Пры гэтым, па словах маці, яна ніколі не пакідала сына без нагляду, а тут здарылася такое...

***

Чарговы выпадак, што ўвайшоў у наш дайджэст, таксама здарыўся ў Барысаве. У выхадны дзень чацвёра ваеннаслужачых 3-га асобнага стралковага батальёна вайсковай часці 3310, што ў Навасадах, вырашылі правесці вольны час у райцэнтры, схадзіць у кіно. Але ўсе планы Рамана Козарава, Яўгена Ходара, Ігара Корхава, Артура Дзямідава перакрэсліла здарэнне, на якое нельга было не адгукнуцца. Хлопцы ўбачылі дым, які валіў з акна на пятым паверсе хрушчоўкі. Яны доўга не разважалі, адразу кінуліся ў пад'езд. Дзямідаў з лесвічнай клеткі пералез у адчыненае акно кватэры, а пасля адамкнуў знутры дзверы таварышам. У кватэры хлопцы ўбачылі мужчыну, які спаў, а навокал ужо загаралася мэбля. На шчасце, жыльца атрымалася вывесці з дома, а полымя — лакалізаваць. Хлопцы, праўда, не лічаць сябе героямі, але паглядзім праўдзе ў вочы; паступілі яны сапраўды па-геройску, адважна ■

НУМАР 102 НЕ ДЛЯ ЖАРТАЎ

Да кожнага званка ў міліцыі ставяцца сур'ёзна. Але не заўжды чалавек на тым канцы праводу звяртаецца да праваахоўнікаў з сапраўднай праблемай. Лічбы сведчаць, сёлета ў міліцыю паступіла каля 5 тысяч ілжывых выклікаў, за якія людзям прыйшлося плаціць штраф.

— З гэтым пытаннем у нас існуе пэўная праблема, — кажа **Ігар Гатальскі, начальнік арганізацыйна-аналітычнага ўпраўлення міліцыі грамадскай бяспекі МУС**. — Міліцыя заўжды імкнецца аператыўна рэагаваць на паведамленні грамадзян. Ёсць нават нарматывы, паводле якіх міліцыянер мусіць прыбыць на месца здарэння за пэўны прамежак часу. Але ёсць катэгорыя людзей, якая тэлефануе далёка не па справе. За такія званкі людзі нясуць адміністрацыйную адказнасць. А яна, дарэчы, складае ад 4 да 15 базавых велічынь. Пры паўторы на працягу года — ад 20 да 50 велічынь.

Ігар Гатальскі кажа, што з агульнай колькасці зарэгістраваных выклікаў прыкладна 70 працэнтаў складаюць тыя, што здзейснены людзьмі ў стане алкагольнага ап'янення. Сітуацыя часам даходзіць да абсурду. Падобны выпадак здарыўся ў Слуцку колькі тыдняў таму. Нецвярозы ў шэсць гадзін раніцы паведаміў міліцыі, што ў яго ўкралі тры тысячы долараў. На месца выехала следча-аператыўная група. Калі пачалі разбірацца, грошы знайшліся ў тумбачцы. Міліцыя з'ехала, аднак праз некалькі гадзін ён зноў тэлефануе і паўторна паведамляе пра крадзеж долараў. Праваахоўнікі зноў паехалі і... знайшлі тыя банкноты. У выніку мужчыну прыйшлося заплаціць штраф. А вось у Пінску жанчына сказала супрацоўнікам міліцыі, што ў яе знік ноўтбук. Як стала вядома, яна выпівала падчас сямейнага свята. Калі пайшла ў краму, схавала камп'ютар ад гасцей пад ложкам, а потым проста пра яго забылася. Ёй таксама прыйшлося заплаціць штраф.

Часам людзі па няведанні тэлефануюць у міліцыю. Аднак, як нам паведамілі ў МУС, усе званкі правяраюцца. І калі чалавек памылкова замест газавай службы набраў «102», падобны выпадак пад парушэнне не падпадае. У дзеяннях правапарушальніка абавязкова павінен прысутнічаць намер.

Вось яшчэ адзін прыклад. Карэліцкі раён. Жанчына пазванiла ў міліцыю і сказала, што яе згвалтаваў кіроўца аўтамабіля. Да яе неўзабаве выехала цэлая група міліцыянераў. Высветлілася, што яна п'яная, а кіроўца проста адмовіўся падвезці яе дадому ў такім стане. Такім чынам яна хацела яму адпомсціць.

Праваахоўнікі падкрэсліваюць, што нават пры вялікім жаданні ў падобных махляроў не атрымаецца сысці ад адказнасці. Усе званкі фіксуюцца, і супрацоўнікі міліцыі заўжды бачаць, з якога нумара тэлефануюць. Аднак ёсць яшчэ адна мера, якая павінна прымусіць чалавека сто разоў падумаць перад тым, як званіць.

— Міліцыя мае ўсе падставы, каб акрамя штрафу спагнаць з правапарушальніка ўсе выдаткі за выезд праваахоўнікаў, — паведамляе Ігар Гатальскі. — Летась жыхар сталіцы паведаміў пра мініраванне аднаго з судоў Мінска. Асобу высветлілі і прыцягнулі да крымінальнай адказнасці. А за эксплуатацыю транспарту, адпрацаваны міліцыяй час з яго дадаткова спагналі 2,5 мільёна рублёў.

Кожны адэкватны чалавек павінен разумець, што ў той час, калі міліцыянер рэагуе на глупства, непадалёк можа здарыцца сапраўднае злачынства. І гэтыя некалькі хвілін могуць адыграць вырашальную ролю.

■ Асоба

ЧАЛАВЕК, ЯКОМУ ШАНЦАВАЛА

Немцев он держал в тревоге,
Те боялись сесть в вагон:
Если Хазов на дороге, —
Прочь с дороги эшелон!

Гэтыя радкі Сяргей Міхалкоў прысвяціў яраслаўскаму хлопцу з вёскі Сунежна Бальшасельскага раёна Васілю Хазаву, які змагаўся на беларускай зямлі з нямецка-фашысцкімі акупантамі. З 1940 года і да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ён праходзіў тэрміновую службу ў асобнай ордэна Леніна мотастралковай дывізіі спецыяльнага прызначэння імя Дзяржынскага. Пайшоў Васіль у армію добраахвотнікам, хоць меў права як адзіны сын у бацькоў пажылога ўзросту і «закасіць».

У першыя ж дні вайны для разведвальнай і дыверсійнай работы ў глыбокім тыле ворага ў Маскве з добраахвотнікаў была створана мотастралковая брыгада асобага прызначэння Наркамата ўнутраных спраў СССР, і Хазаў быў пераведзены ў полк №2 на пасаду камандзіра аддзялення падрыўнікоў у партызанскім атрадзе імя Воранава. Разам з таварышамі Іванам Алтынавым і Дзмітрыем Нікіціным у канцы лютага 1942 года Васіль быў накіраваны ў спецатрад «Гроза», што дзейнічаў на тэрыторыі Мінскай і Віцебскай абласцей. Хлопцы на чыгункі Маладзечна — Полацк, а таксама ў Мсціслаўскім і Докшыцкім раёнах пусцілі пад адхон 11 эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай ворага. У выніку фашысты страцілі 1600 чалавек забітымі і параненымі, было знішчана 11 паравозаў, больш за 100 вагонаў, 8 танкаў і шмат іншай тэхнікі. Падрыўнікі ўзарвалі спіртзавод у мястэчку Ілава, на станцыі Бурбіна разам з партызанамі пад камандаваннем

К. Заслонава знішчылі нарабаванае і падрыхтаванае фашыстамі для вывазу ў Германію збожжа.

Асабліва памятны расказ Васіля Фёдаравіча пра паядынак з гітлераўцамі недалёка ад вёскі Хілаўшчына, што ў Докшыцкім раёне каля станцыі Параф'янава. Па ўсіх мерках там ён павінен быў застацца навечна. Але лёс распарадзіўся па-свойму.

...Падрыўная група Хазава атрымала заданне пусціць пад адхон варожы эшалон, але дабрацца да чыгуначнага палатна было немагчыма: 50-метровая паласа з абодвух бакоў завалена ссечанай вольхай і добра прыстраляна з дзотаў і вышак. Калі ж замініраваць ноччу, то раніцай міну абавязкова знайшлі б пры абходзе.

Васіль вырашыў перахітрыць фашыстаў. Калі здалёк пачуўся гул цягніка, прыгатаваў самаробны запал, дзе замест узрывальніка прыладзіў запальную трубку з пауметрам бікфордава шнура, падпаліць які трэба было ўсяго за хвіліну да выбуху.

Вось да цягніка засталося метраў чатырыста, і Хазаў кінуўся наперарэз паравозу. І адразу ж вакол засвісталі кулі: немцы па смельчаку адкрылі шчыльны агонь. Адважны падрыўнік бег, пятляючы, як заяц. На паўдарозе падпаліў шнур і за 50 метраў да цягніка, што набліжаўся, засунуў тол пад рэйку. А сам, імгненна скаціўшыся пад адхон, кінуўся да лесу. За спінай прагрымеў выбух. Васіль Хазаў выйграў гэты паядынак. Пацярпела толькі біклажка, прабітая куляй...

Лот №19. Машина трясильная ТН-112-01, инв. №539, 2010 г.в. Нач. цена: 55 670 460/5 567,05 бел. руб. без НДС. Задаток: 5 568 000/556,80 бел. руб.

Лот №20. Агрегат мягко-трепальный МТА-2Л, инв. №538, 2010 г.в. Нач. цена: 527 655 923/52 765,60 бел. руб. без НДС. Задаток: 52 766 000/5276,60 бел. руб.

Лот №21. Машина мяльная М-110-Л, инв. №537, 2010 г.в. Нач. цена: 73 361 591/7 336,16 бел. руб. без НДС. Задаток: 7 337 000/733,70 бел. руб.

Лот №22. Панель автоматизации, инв. №551, 2011 г.в. Нач. цена: 1 538 848/153,89 бел. руб. без НДС. Задаток: 154 000/15,40 бел. руб.

Лоты №23–26. Сушилка СКП-10КУ, 1979 г.в. Нач.цена за 1 лот: 43 730 398/4 373,04 бел. руб. без НДС. Задаток: 4 374 000/437,40 бел. руб.

Лоты №27-30. Трясильная машина ТГ-135, 1979 г.в. Нач.цена за 1 лот: 5 289 988/529,0 бел. руб. без НДС. Задаток: 529 000/52,90 бел. руб.

Лот №31. Пресс РП-5, инв. № 179, инв. №179, 1979 г.в. Нач. цена: 4 422 968/442,30 бел. руб. без НДС. Задаток: 443 000/44,30 бел. руб.

Лот №32. Пресс РП-5УМ, инв. №187, 1979 г.в. Нач. цена: 5 136 350/513,64 бел. руб. без НДС. Задаток: 514 000/51,40 бел. руб.

Лот №33. Машина СМТ-200, инв. №235, 1985 г.в. Нач. цена: 9 065 174/906,52 бел. руб. без НДС. Задаток: 907 000/90,70 бел. руб.

Лот №34. Машина МТА-1Л, инв. №256, 1988 г.в. Нач. цена: 81 194 510/8 119,46 бел. руб. без НДС. Задаток: 8 120 000/812 бел.руб..

Лот №35. Кудельно-приготовительный агрегат КПЛМ-2М, инв. №167, 1979 г.в. Нач. цена: 3 189 665 / 318,97 бел. руб. без НДС. Задаток: 319 000/31,90 бел. руб.

Лот №36. Циклон ЦН-15, инв. №322, 1992 г.в. Нач. цена: 8 052 920/805,30 бел. руб. без НДС. Задаток: 806 000/80,60 бел. руб.

Лот №37. Пневмотранспортер, инв. №100, 1961 г.в. Нач. цена: 3 408 486/340,85 бел. руб. без НДС. Задаток: 341 000/34,10 бел. руб.

Лот №38. Пресс паковочный РП-5, инв. №50, 1972 г.в. Нач. цена: 6 202 497/620,25 бел. руб. без НДС. Задаток: 621 000/62,10 бел. руб.

Лот №39. Пресс паковочный РП, инв. №51, 1974 г.в. Нач. цена: 11 375 318/1 137,54 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 138 000/113,80 бел. руб.

Лот №40. Пресс НВВ, инв. №57, 1990 г.в. Нач. цена: 8 656 868/865,69 бел. руб. без НДС. Задаток: 866 000/86,60 бел. руб.

Лот №41. Станок СМТ-200, инв. №59, 1991 г.в. Нач. цена: 5 374 010/537,40 бел. руб. без НДС. Задаток: 538 000/53,80 бел. руб.

Лот №42. Трепальное колесо, инв. №104,1965 г.в. Нач. цена: 4 701 405/470,14 бел. руб. без НДС. Задаток: 471 000/47,10 бел. руб.

Лот №43. Машина разрывная (гидропресс), инв. №63, 1996 г.в. Нач. цена: 5 916 370/591,64 бел. руб. без НДС. Задаток: 592 000/59,20 бел. руб.

Лот №44. Циклон, инв. №299, 1991 г.в. Нач. цена: 460 127/46,01 бел. руб. Задаток: 46 000/4,6 бел. руб.

Лот №45. Машина сушильная СКП-10КУ, инв. №39, 1985 г.в. Нач. цена: 4 195 116/419,51 бел. руб. без НДС. Задаток: 420 000/42 бел. руб.

Лот №46. Станок СМТ-200М, инв. №250, 1987 г.в. Нач. цена: 4 836 609/486,66 бел. руб. без НДС. Задаток: 484 000/48,40 бел. руб.

Лот №47. Машина МТА-2Л, инв. №188, 2005 г.в. Нач. цена: 359 765 402/35 976,54 бел. руб. без НДС. Задаток: 35 977 000/3597,70 бел. руб.

Лот №48. Прицеп СТС-12, рег. знак БХ 9341, 2009 г.в. Нач. цена: 4 150 000/415 бел. руб. без НДС. Задаток: 415 000/41,50 бел. руб.

Лот №49. Прицеп ГКБ-817, инв. №285, 1990

алімпіец
ЗВЯЗДА
ВЫПУСК № 6 (43)
Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь

■ За кадрам

НА ГУЛЬНІ — МОДНАЙ КАМАНДАЙ

У НАК прэзентавалі парадную і спартыўную форму для беларускай дэлегацыі на Алімпіяду-2016

Айчынныя дызайнеры Іван Айплатаў і Юлія Латушкіна сумесна з прадпрыемствамі канцэрна «Беллегпрам» распрацавалі калекцыю адзення спецыяльна для беларускіх спартсменаў.

Фота БЕЛТА.

Першая серыя выйшла пад назвай «Беларусь сінявокая. Васількі». Сіні колер на адзенні сімвалізуе нацыянальныя багацці краіны — рэкі і азёры. Таксама на форме выкарыстаны арнамент, у аснове якога — стылізаваны васілёк. Аднак па выніках апытання спартсменаў і трэнераў перавага была аддадзена другой калекцыі Юліі Латушкінай «Беларусь спартыўная. Сіла перамог». Мадэлі там выкананы ў чырвоным, шэрым і белым колерах, таксама выкарыстаны нацыянальныя матывы і арнамент з васілька. Аздабленне касцюмаў і элементы традыцыйнай вышыўкі падкрэсліваюць нацыянальную прыналежнасць.

Выкарыстаныя пры стварэнні адзення сучасныя матэрыялы і тэхналогіі ў поўнай меры ўлічваюць пажаданні і водгукі спартсменаў, а таксама кліматычныя асаблівасці Бразіліі.

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка высока ацаніў якасць прадстаўленага адзення, па яго даручэнні ўсе распрацаваныя калекцыі знаходзяцца ў вольным продажы ў беларускіх крамах. «Гэтая форма павінна быць у вольным продажы, каб кожны чалавек, калі ў яго ёсць жаданне, мог купіць яе і тым самым далучыцца да Рыа і спорту ў цэлым», — сказаў Прэзідэнт

■ Экспрэс-навіны

25 ШАНЦАЎ УВАЙСЦІ Ў ГІСТОРЫЮ

Паводле афіцыйнай інфармацыі Міжнароднага алімпійскага камітэта, 134 беларускія спартсмены ў 25 відах спорту на сённяшні дзень выканалі асноўныя кваліфікацыйныя патрабаванні і нарматывы для ўдзелу ў Гульнях-2016.

Наша краіна будзе прадстаўлена ў наступных відах алімпійскай праграмы: баскетбол, бокс, барацьба, веласпорт, гімнастыка спартыўная і мастацкая, акадэмічнае веславанне, веславанне на байдарках і каноэ, дзюдо, конны спорт, лёгкая атлетыка, настольны тэніс, парусны спорт, плаванне, скачкі ў ваду, скачкі на батуце, сінхроннае плаванне, сучаснае пяцібор'е, стральба з лука, кулявая стральба, таэквандо, тэніс, цяжкая атлетыка і фехтаванне.

У тым ліку чарговыя кваліфікацыйныя нарматывы для выступлення на Алімпіядзе выканалі ў мінулы ўік-энд беларускія лёгкаатлеты на чэмпіянаце краіны ў Гродне. Ірына Якалцэвіч стала чэмпіёнкай па скачках з шастом з вынікам 4 м 50 см. У спаборніцтвах мужчын у трайным скачку алімпійскія пропускі зарабілі ўсе прызёры — Арцём Бандарэнка, Дзмітрый Платніцкі і Максім Несцярэнка. Да выдатных вынікаў вярнуўся вопытны кідальнік молата Іван Ціхан. Ён паказаў другі вынік сезона ў свеце, паслаўшы снарад на 80 м 04 см.

Аліна Талай прадказальна стала чэмпіёнкай краіны ў бегу на 100 м з бар'ерамі, у сусветным рэйтынгу яна займае цяпер 6-е месца.

УЖО ЗНАЁМЫЯ КАНКУРЭНТЫ

Сталі вядомы саперніцы нашых баскетбалістак на Алімпійскіх гульнях у Рыа-дэ-Жанэйра

На папярэднім этапе беларускі згуляюць у групе А супраць каманд Японіі (6 жніўня), Францыі (7 жніўня), Бразіліі (9 жніўня), Турцыі (11 жніўня) і Аўстраліі (13 жніўня). Са сваімі першымі саперніцамі падапечныя Анатоля Буяльскага сустракаліся зусім нядаўна: на турніры памяці Халіпскага ў Мінску, тады нашы дзяўчаты перамаглі з лікам 78:77. На гэтых жа спаборніцтвах зборная Беларусі саступіла камандзе Турцыі — 61:65.

Група В на Алімпіядзе ў Рыа-дэ-Жанэйра склалася з баскетбалістак ЗША, Канады, Іспаніі, Сенегала, Сербіі і Кітая.

Пасля заканчэння групавога раўнда ў чвэрцьфінал выйдуць па 4 лепшыя зборныя, якія працягнуць барацьбу за ўзнагароды па сістэме плэй-оф. Чэмпіён і прызёры Гульняў вызначацца 20 жніўня.

Нагадаем, што нашы дзяўчаты выступяць на Алімпійскіх гульнях другі раз. У 2008 годзе ў Пекіне каманда Анатоля Буяльскага заняла 6-е месца.

СПОРТ БЕЗ АБМЕЖАВАННЯЎ

Алімпійская каманда бежанцаў прыме ўдзел у Гульнях-2016

Дзесяць спартсменаў-бежанцаў паспрабуюць прыцягнуць увагу сусветнай грамадскасці да праблемы міграцыйнага крызісу падчас Алімпійскіх гульняў 2016 года ў Рыа, дзе гэтым летам яны будуць выступаць як сімвал надзеі ва ўсім свеце.

Спартсмены пазмагаюцца за зборную бежанцаў, якая з'яўляецца першай у сваім родзе. На цырымоніі адкрыцця каманда будзе ісці з алімпійскім сцягам перад дэлегацыяй Бразіліі.

Прадставяць каманду выхадцы з Сірыі, Паўднёвага Судана, Эфіопіі і Конга. Яны будуць спаборнічаць у такіх дысцыплінах як плаванне, лёгкая атлетыка і дзюдо. Абвяшчаючы склад каманды, **прэзідэнт МАК Томас Бах** сказаў: *«Гэтыя людзі не маюць ні дома, ні каманды, ні сцяга, ні нацыянальнага гімна. Мы дадзім ім дом у алімпійскай вёсцы, дзе яны будуць жыць разам са спартсменамі з усяго свету. Алімпійскі гімн будзе гучаць у іх гонар. Зборная стане сімвалам надзеі для ўсіх у нашым свеце і раскажа пра маштабы гэтага крызісу»*

■ Легенды спорту

САВЕЦКІ МЯДЗВЕДЗЬ

ГІСТОРЫЯ НАЙЛЕПШАГА БАРЦА XX СТАГОДДЗЯ

Ён стаў сапраўдным сімвалам цэлай спартыўнай эпохі, сваім прыкладам выхаваў цэлую плеяду маладых атлетаў і даказаў, што немагчымае магчыма. Аляксандр Мядзведзь па праву прызнаны найлепшым барцом вольнага стылю мінулага стагоддзя, тры Алімпіяды запар ён не пакідаў вышэйшай прыступкі п'едэстала, сем разоў станавіўся пераможцам на чэмпіянатах свету... І яго гісторыя працягваецца сёння.



ВЫТОКІ

Аляксандр Васілевіч нарадзіўся на ўкраінскай зямлі ў невялікім мястэчку Белая Царква ў сям'і лесніка. Яго дзяцінства прыпала на ваенныя і пасляваенныя гады. Цяпер вядомы спартсмен успамінае, што менавіта гэта загартавала яго характар і было першай, але вельмі істотнай школай жыцця. *«Гаспадарка ў нас у сям'і была вельмі вялікая, а сачыць за ёй і апрацоўваць усё гэта прыходзілася ўручную. Таму я і араў, і сеяў, і дровы нарыхтоўваў. Самае складанае было раскалоць дубовы пень. Гэта цэлае мастацтва, і яго даводзілася спасцігаць»*, — распавядае Аляксандр Мядзведзь.

«Без такога надзейнага тылу не было б мяне. Я заўсёды і ва ўсім ставіў на першы план сям'ю.

Не выпадкова ўжо пазней, у гады яго слаўнай спартыўнай кар'еры, усе будуць захапляцца неверагодна ўчэпістымі і спрытнымі рукамі, а чэмпіён прызнаецца: *«Кісці ў мяне напрацаваны з дзяцінства»*.

Трэба аддаць даніну і выдатным генам. Па ўспамінах Мядзведзя, добрымі фізічнымі данымі валодалі многія яго сваякі, а бабулю будучага барца так і называлі — «мядзведзіца». Жанчына мела рост 185 см і насіла 45 памер абутку.

ЯК НАРАДЖАЛАСЯ ЛЕГЕНДА

Сам Аляксандр, вядома, не адразу зразумеў, што яго жыццё ператворыцца ў сапраўдную і бясконцую барацьбу. Ён спрабаваў займацца рознымі відамі спорту: валейбол, баскетбол, лёгкая атлетыка, а неяк нават запісаўся ў секцыю па гімнастыцы, але трэнер не падтрымаў ініцыятывы маладога хлопца. *«Ідзі адсюль! Што я, перакладзіны падымаць з-за цябе буду?»* — быццам гэта было ўчора, успамінае словы настаўніка Аляксандр Васілевіч. (Хлопец меў рост больш за 190 см і вагу звыш 90 кг.)

У секцыю барацьбы Мядзведзь трапіў толькі ў 16 гадоў, але прабыў там нядоўга: маладому чалавеку трэба было зарабляць грошы, таму ён уладкаваўся зборшчыкам на завод, а неўзабаве пашоў у войска.

Аляксандр трапіў у танкавую часць і адразу звярнуў на сябе ўвагу. Спачатку для яго не знайшлося падыходзячага па памеры абутку, таму месяц ён праходзіў у тапачках. Потым праз свой рост не мог працяглы час глядзець у акенца танка (каб бачыць дарогу) і ў выніку гэтага паваліў пару сосен. Ну і нарэшце, па прызнанні самога героя, менавіта ў войску пачалася сур'ёзная спартыўная кар'ера Мядзведзя. *«Там я ўпершыню заявіў пра сябе як барца, атрымаўшы перамогу над лейтэнантам Іванам Кацагубам, чэмпіёнам Мінскай вобласці па барацьбе. Схватка працягвалася нядоўга. Я скруціў яго ў ахапак, падняў і прыціснуў галавой да дывана. Без усялякіх бачных высілкаў. Здаецца, у той момант я канчаткова зразумеў, што барацьба — гэта маё прызначэнне»*, — распавядае Аляксандр Васілевіч.

З тых часоў перамог у Аляксандра Мядзведзя было шмат: валявых, яркіх, простых і не вельмі. Ён уварваўся ў барцоўскі свет і, не баючыся аўтарытэтаў, крок за крокам сам станавіўся кумірам для многіх. Паядынкі з яго ўдзелам любілі не толькі гледачы, але і суддзі, таму што тэхніка Мядзведзя была вельмі разнастайнай, публіка з замiраннем сэрца назірала, як савецкі спартсмен спраўляецца з барцамі, большымі за яго па масе і аб'ёме. Ну а пра трываласць і сілу волі Аляксандра Васілевіча хадзілі легенды. *«Калі хочаш дасягнуць перамогі, трэба ўмець перамагчы боль, і я гэта рабіў шмат разоў. Мне было ўсё роўна, колькі важыць мой сапернік, якога ён росту... нават калі ён важыў 100 кг, ён усё роўна апынаўся на дыване. Я бачыў мэту і не думаў пра тое, што яе немагчыма ўзяць»*, — і цяпер з поўнай упэўненасцю расказвае Мядзведзь.

Нагляднае ўяўленне пра тое, як ён змагаўся з болем, усе атрымалі ў адным з паядынкаў з адным з галоўных сапернікаў Мядзведзя (а за межамі дывана — сябрам), спартсменам з ФРГ Вільфрыдам Дзітрыхам. Неяк яны сышліся ў фінальным паядынку за тытул чэмпіёна. Немец не стаў траціць час на «гульню» і рушыў на савецкага барца напралом. Неўзабаве здарылася неспадзяванае. У цішыні велічэзнай залы раптам пачуўся моцны і страшны хруст, абодва барцы спынілі схватку, а суддзя, спахапіўшыся, свіснуў толькі тады, калі Вільфрыд убачыў, што вялікі палец правай рукі Мядзведзя ненатуральна тарчыць убок. На дапамогу Аляксандру паспяшаліся медыкі, але не паспелі дабрацца да спартсмена, як той на вачах у здзіўленай публікі сам паставіў палец на месца і даў суддзі знак, што можа працягваць паядынак. Сутычка працягнулася, але Дзітрыха з гэтай секунды быццам падмянілі, пасля атакі Аляксандра ў ногі ён закульгаў, а затым... наогул адмовіўся ад паядынку. Той выпадак Мядзведзь успамінаць не любіць, але аднойчы ён прызнаўся: *«У той момант у мяне пацямнела ў вачах...»*

Аляксандр Мядзведзь — чалавек, які ведае кошт перамогам: ведае, што такое боль, а галоўнае, як яго пераадолець. Напэўна, таму сваю высакароднасць ён пранёс праз усё жыццё, праяўляючы яе як на дыване, так і за яго межамі. Яшчэ ў гады сваёй кар'еры Аляксандр Васільевіч атрымаў прыз «За высакароднасць у спорце», заснаваны ЮНЕСКА. У сутычцы з іранскім барцом, у якога была траўмаваная нага, у ходзе паядынку Мядзведзь ні разу не ўзяўся за яе.

СЫШОЎ НЕПЕРАМОЖАНЫМ

Пасля свайго першага алімпійскага золата ў 1964-м Аляксандр Мядзведзь стаў самым лепшым у сваім відзе і на наступнай Алімпіядзе, у 1968 годзе, а на трэція Гульні ў кар'еры ў Мюнхен-72 ён адправіўся ўжо ў 35-гадовым узросце і ведаў, што, хутчэй за ўсё, яны стануць для яго апошнімі.

БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА

Нарадзіўся 16 верасня 1937 года ў горадзе Белая Царква, савецкі спартсмен (вольная барацьба), заслужаны майстар спорту. Алімпійскі чэмпіён па вольнай барацьбе (у 1964-м — у паўцяжкай вазе, у 1968 і 1972 гадах — у цяжкай вазе). Чэмпіён свету 1962-1963, 1966-1967, 1969-1971 гадоў. Чэмпіён Еўропы 1966, 1968, 1972 гадоў. Чэмпіён СССР 1961-1963, 1966-1970 гадоў. Узнагароджаны сярэбраным алімпійскім ордэнам і медалём ЮНЕСКА «За высакароднасць у спорце».

У паўфінале яго сапернікам стаў амерыканец Крыс Тэйлар, які важыў больш за 190 кілаграмаў — амаль на сотню больш за Мядзведзя. Перамога над ім далася нашаму спартсмену вельмі цяжка. У гэтай сутычцы Аляксандр Васілевіч зарабіў траўматычны радыкуліт, а напярэдзе яшчэ быў фінал. У вырашальным паядынку Мядзведзь сустрэўся з даўнім сваім сапернікам — балгарынам Асманам Дураліевым. Ён таксама хацеў пакінуць спорт пасля гэтай Алімпіяды, пайсці, адабраўшы ў Мядзведзя «золата». Гэты неверагодны па напрузе паядынак скончыўся пераканаўчай перамогай савецкага барца. Мядзведзь пакланіўся ва ўсе бакі гледачам, выйшаў на сярэдзіну дывана, упаў на калені і пацалаваў яго... Зала ўстала і абрынула на трохразовага алімпійскага чэмпіёна гром апладысментаў.

Публіка з замiраннем сэрца назірала, як савецкі спартсмен спраўляецца з барцамі, большымі за яго па масе і аб'ёме.

«Самыя ўзвышаныя пачуцці спартсмена ўзнікаюць, калі ён падымаецца на п'едэстал. Калі ты стаіш, іграе гімн і адразу ўспамінаеш сваю радзіму, сям'ю. Адчуваеш гонар за сябе, за тое, што ты апраўдаў давер. Гэта самыя выдатныя пачуцці ў жыцці, гэта непаўторна», — кажа Аляксандр Васілевіч.

ПРАЦЯГ ЁСЦЬ

Стаўшы першым трохразовым алімпійскім чэмпіёнам у вольнай барацьбе, ён пакінуў спорт, але назаўжды ўпісаў сваё імя ў сусветную гісторыю. Мядзведзь быў прызнаны найлепшым барцом вольнага стылю ў гісторыі спорту і ўведзены ў залу спартыўнай славы барацьбы. На Алімпійскіх гульнях ён тройчы быў сцяганосцам, а паралельна спартыўнай кар'еры стварыў надзейны тыл у выглядзе моцнай сям'і. *«Без такога надзейнага тылу не было б мяне. Я заўсёды і ва ўсім ставіў на першы план сям'ю. І ні разу пра гэта не пашкадаваў»*, — кажа Аляксандр Мядзведзь. Сёння гэта ўжо вялікая сям'я: у Аляксандра Васілевіча двое дзяцей (дачка і сын), ёсць унукі і нават праўнукі. Сын Аляксей пайшоў па слядах свайго бацькі і таксама займаўся барацьбой. Гены, уласны талент і тата-трэнер прывялі Аляксея да чэмпіёнскага тытулу. Са сваёй жонкай Таццянай Аляксандр Васілевіч пражыў усё жыццё (на жаль, сёлета яе не стала)...

Аляксандр Мядзведзь з'яўляецца моцнай апорай, верным сябрам, мудрым настаўнікам і бацькам не толькі для сваёй сям'і, але і для многіх іншых. Ён выхаваў далёка не аднаго прызёра і чэмпіёна прэстыжных спартыўных турніраў. *«Мяне ён навучыў самаму галоўнаму, таму, што быць трохразовым алімпійскім чэмпіёнам магчыма. На працягу ўсёй кар'еры Аляксандр Васілевіч быў маім маяком»*, — гаворыць неаднаразовы чэмпіён Алімпійскіх гульняў, чэмпіянатаў свету і Еўропы Аляксандр Карэлін.

У арсенале легендарнага барца сёння маецца ўласная кніга («Усё жыццё — барацьба»), ужо больш за 40 гадоў праходзіць турнір імя Аляксандра Мядзведзя, сам майстар і сёння выкладае ва ўніверсітэце, а значыць, яго гісторыя працягваецца...

БАРАЦЬБА ЗРАБІЛА З ЯГО САПРАЎДНАГА МЯДЗВЕДЗЯ

Вынікі прыйшлі да маладога хлопца даволі хутка, на сваім першым чэмпіянаце СССР ён увайшоў у дзясятку лепшых, а ўжо ў 1961 годзе заваяваў свой першы залаты медаль на асабістым першынстве СССР па вольнай барацьбе ў цяжкай вазе. Гэтая перамога адкрыла дарогу на Алімпійскія гульні 1964 года ў Токіа, дзе Аляксандр узышоў на Алімп барцоўскай славы. Гэтае «золата» далося яму з вялікай цяжкасцю і ад таго стала асабліва каштоўным. *«Ведаеце, што мяне засмучала, калі вярнуўся з Токіа? Што бацька да гэтага дня не дажыў, не меў магчымасці ацаніць мой трыумф. Ён заўсёды мяне крыху недаацэньваў і барацьбу маю ўсур'ёз ніколі не ўспрымаў, а я хацеў яму даказаць, што барацьба — гэта маё і што мы, Мядзведзі, моцныя ва ўсім»*, — ужо праз гады падзеліцца сваімі перажываннямі славуты спартсмен.


Алімпіяда-1972. Мюнхен. Паядынак Аляксандра Мядзведзя і амерыканскага барца Крыса Тэйлара.

ЯНЫ ДАСТАЮЦЦА ПЕРАМОЖЦАМ

ПРА 5 САМЫХ ВЯДОМЫХ СПАРТЫЎНЫХ УЗНАГАРОД

Трафей — прыкмета лідарства, паказчык сілы і рэч, якую жадае атрымаць кожны спартсмен з самага дзяцінства. На гэта ідуць лепшыя гады атлетаў, а разам з імі сілы і часам самае каштоўнае — здароўе. Усё для таго, каб хаця б на імгненне дакрануцца да запаветнага прыза. Сёння мы разгледзім самыя вядомыя і папулярныя спартыўныя кубкі свету.

Кубак Стэнлі



Турнір: Нацыянальная хакейная ліга, плэй-оф.
Від спорту: хакей
Гісторыя: У 1892 годзе генерал-губернатар Канады Фрэдэрык-Артур лорд Стэнлі Прэстан у адной з крам Лондана звярнуў увагу на вялікую сярэбраную чашу, якую тут жа купіў за 10 гіней. Пазней Стэнлі ўзнагародзіў ёю пераможцу чэмпіянату Канады сярод аматарскіх хакейных камандаў і назваў гэты прыз «Хакейным кубкам выкліку». Але такая назва не прыжылася, і трафей перайменавалі ў гонар генерал-губернатара.

У 1927 годзе ён стаў галоўнай узнагародай НХЛ, а праз 30 гадоў зведаў першыя змены. Паколькі для гравіроўкі прозвішчаў гульцоў, трэнераў, менеджараў і персаналу каманды-чэмпіёна патрабавалася шмат месца, прыйшлося дадаць кольца. Яго хапіла да пачатку 90-х, калі кольцы з імёнамі ранейшых пераможцаў знялі і адправілі ў Залу хакейнай славы, а да Кубка прымайстравалі новыя.

Галоўнай асаблівасцю Кубка Стэнлі з'яўляецца тое, што кожны гулец каманды, якая заваявала яго, мае права рабіць з ім што хоча на працягу сутак. Дзякуючы гэтай традыцыі сярэбраная чаша пабывала і ў Беларусі: Кубак на радзіму жонкі прывёз Мікалай Хабібулін, які выйграў трафей у 2004 годзе разам з «Тампай».

Кубак Дэвіса



Турнір: Кубак Дэвіса.
Від спорту: тэніс
Гісторыя: Усё пачалося з таго, што чатыром студэнтам Гарварда прыйшла ў галаву ідэя арганізаваць спаборніцтвы па тэнісе для нацыянальных зборных. Адзін з іх, Дуайт Дэвіс, на свае грошы купіў сярэбраную чашу, якую ўпершыню ўручылі пераможцу ў 1900 годзе.

Турнір першапачаткова называўся International Lawn Tennis Challenge, сваю сучасную назву ён атрымаў пасля смерці Дэвіса ў 1945 годзе. Зараз галоўны тэнісны трафей складаецца з чатырох частак: самой сярэбранай салатніцы і трох драўляных падставак, да якіх мацуюцца сярэбраныя шыльды з імёнамі тэнісістаў з камандаў-пераможцаў. На працягу года прыз захоўваецца ва ўладальніка чэмпіёнскага тытула, пасля чаго перадаецца наступнаму пераможцу, а яго папярэднік на памяць атрымлівае паменшаную копію.

За час правядзення спаборніцтваў чатырнаццаць краін змаглі выйграць хаця б адзін чэмпіёнскі тытул. Лідарам тут з'яўляецца зборная ЗША (32 разы), на другім месцы зборная Аўстраліі (28 разоў). Беларусь дэбютавала ў Сусветнай групе Кубка Дэвіса матчам з Расіяй у лютым 2004 года, найлепшы вынік нашых тэнісістаў на гэтым турніры — паўфінал.

Кубак свету FIFA

Турнір: чэмпіянат свету па футболе.
Від спорту: футбол
Гісторыя: Першапачаткова прыз, які ўручаўся за перамогу на першых чэмпіянатах свету па футболе, насіў назву «Багіня Перамогі», а ў 1946 годзе ён быў афіцыйна перайменаваны ў гонар прэзідэнта ФІФА Жуля Рыме, які стаў ініцыятарам правядзення сусветнага футбольнага турніру. Кубак зроблены па эскізе французскага скульптара Абеля Лафлёра і выраблены з пазалочанага серабра 925-й пробы з падстаўкай з лазуриту. Вышыня трафея 35 см, яго вага 3,8 кг. Кубак уяўляў сабой васьмівугольную чашу, якую трымала крылатая фігура Нікі — старажытнагрэчаскай багіні перамогі.

20 сакавіка 1966 года, за чатыры месяцы да чэмпіянату свету ў Англіі, прыз быў выкрадзены падчас яго публічнай дэманстрацыі ў лонданскай выставачнай зале Westminster Central Hall. Праз сем дзён статуэтка была знойдзена загорнутай у газету пад лаўкай у прыгарадным парку на поўдні Лондана. У 1970 годзе зборная Бразіліі стала чэмпіёнам свету трэці раз, што дазволіла ёй забраць сабе ў вечнае валоданне трафей, як і было агаворана пры заснаванні прыза Жулем Рыме. Пазней статуэтка зноў была выкрадзена, і на гэты раз ужо не знойдзена.

Цяпер узнагарода, якая ўручаецца за перамогу на чэмпіянаце свету, уяўляе сабой залаты кубак, дзе дзве фігуры трымаюць на выцягнутых руках зямны шар. Такім галоўны футбольны трафей стаў толькі ў 1974 годзе і існуе па гэты дзень. У адрозненне ад свайго папярэдніка, цяперашні кубак ніколі не будзе перададзены ніводнай краіне-пераможцы. На памяць аб трыумфе чэмпіёнам уручаюць яго пазалочаную копію.

Кубак Лары О'Браена

Турнір: Нацыянальная баскетбольная асацыяцыя.
Від спорту: баскетбол
Гісторыя: Галоўны трафей чэмпіёнаў NBA за сваю 65-гадовую гісторыю тройчы змяніў імя. Першапачатковая назва — NBA Finals trophy — у 1964 годзе змянілі на Кубак Уолтара А. Браўна ў гонар уладальніка клуба Boston Celtics, які адыграў вялікую ролю ў аб'яднанні Нацыянальнай баскетбольнай лігі і баскетбольнай асацыяцыі Амерыкі. У 1977 годзе было вырашана змяніць дызайн кубка, ён стаў падобным хутчэй на старадаўнюю чашу, чым на спартыўны трафей. Так з'явіўся прыз у выглядзе мяча, які ўлятае ў кошык, трафей выраблены з серабра і золата.

Пазней было вырашана перагледзець і сістэму захоўвання трафея: да гэтага прыз, падобна Кубку Стэнлі, даставаўся чэмпіёну ўсяго на адзін год, але з 1978-га кубак, які вырабляецца кампаніяй Tiffany & Co, перадаецца клубу-пераможцу на вечнае захоўванне.

У 1984 годзе адбылося апошняе змяненне — прыз назвалі ў гонар Лары О'Браена, аднаго з вядучых дзеячаў Нацыянальнай дэмакратычнай партыі, былога генеральнага паштмайстра ЗША. З 1975-га па 1984 год ён працаваў камісарам NBA і актыўна развіваў амерыканскі баскетбольны чэмпіянат.

Кубак еўрапейскіх чэмпіёнаў

Турнір: Ліга чэмпіёнаў УЕФА.
Від спорту: футбол
Гісторыя: Стары кубак чэмпіёнаў уяўляў вялікую сярэбраную амфару вышынёй 60 см з надпісам на французскай мове «Кубак еўрапейскіх клубаў чэмпіёнаў». Гэты прыз атрымаў у 1966 годзе вечную прапіску ў музеі мадрыдскага «Рэала», якому за адзінаццаць першых розыгрышаў Кубка шэсць разоў удалося стаць пераможцам. Цяперашні трафей з'яўляецца ўжо пятай версіяй у яго сучасным дызайне. Ён уяўляе сабой сярэбраную амфару з залатым пакрыццём унутры. Вышыня яе складае 73,5 см, вага — 7,5 кг, намінальны кошт — 10 тысяч швейцарскіх франкаў. На задняй сценцы кубка выгравіраваны назвы клубаў, якія станавіліся яго ўладальнікамі ў розныя гады. Вытворца кубка — швейцарскі ювелір Юрг Стадэльман.

З-за арыгінальнага дызайну ручак кубка ў многіх краінах яго называюць «Вялікія вушы». Звычайна клуб, які выйграў турнір, пакідае кубак у сябе толькі на дзесяць месяцаў: ён абавязаны вярнуць трафей назад УЕФА за два месяцы да наступнага фіналу, а ў памяць аб перамозе атрымлівае паменшаную копію кубка. УЕФА затым перадае ганаровы трафей на захаванне гораду, які прымае чарговы фінал Лігі чэмпіёнаў.

Правіламі прадугледжана, што трафей застанецца ў каманды навечна, калі яна выйграе турнір альбо пяць разоў у суме, альбо тройчы запар. Кубак заставаўся на вечнае захоўванне ў шасці камандаў: «Рэал Мадрыд», «Аякс», «Баварыя», «Мілан», «Ліверпуль», «Барселона».

Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. lobazhevich@zviazda.by

■ І мы там былі

Дзень горада на 10 балаў!

У Віцебску тры дні святкавалі 1042-ю гадавіну заснавання горада. Нягледзячы на тое, што дата не круглая, адбылося нямала падзей, якія запомняцца надоўга. У прыватнасці, цяпер можна прайсціся па вуліцы Марка Шагала. Упершыню шанавалі лаўрэатаў звання «Віцяблянін года»...

І МІЖНАРОДНЫ ФЕСТЫВАЛЬ ФАТОГРАФАЎ

Гонару стаць «Віцяблянінам года» ўдастоіліся міліцыянер, які выратаваў дзіця на дарозе ад сутыкнення з аўто, спартсмены, актрыса, бізнесмен...

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр Косінец стаў ганаровым грамадзянінам горада Віцебска. Калі ён узначальваў Віцебскі аблвыканкам, шмат зрабіў для аднаўлення храмаў, развіцця прадпрыемстваў. Ён быў ініцыятарам усталявання помнікаў.

Падчас святкавання на плошчы Тысячагоддзя Віцебска прэзентавалі скульптурную кампазіцыю, прысвечаную князю Аляксандру Неўскаму, яго жонцы, віцебскай княжне Аляксандры і іх сыну Васілю. На цырымоніі адкрыцця прысутнічалі кіраўнікі вобласці і горада. Недалёка ад яго — самая старая ў горадзе Дабравешчанская царква, пабудаваная ў XII стагоддзі, і царква ў гонар святога Аляксандра Неўскага, узведзеная ў 1990-я гады. У планах — узвядзенне самага вялікага ў краіне будынка ЗАГС.

А на супрацьлеглым беразе Заходняй Дзвіны ўстанавілі драўляную трохметровую скульптуру княгіні Вольгі. Яна, згодна з легендай, заснавала горад. Вольгу можна ўбачыць ля аднаго з трох былых саляных складоў, пабудаваных ў XVIII стагоддзі. Там знаходзіцца культурна-гістарычны комплекс «Залатое кола горада Віцебска «Дзвіна».

Адкрылі і памятную дошку ў гонар паэта Давіда Рыгоравіча Сімановіча. Творца шмат зрабіў для таго, каб у Віцебску захоўвалі памяць пра Шагала. Цяпер ёсць вуліца Марка Шагала (частка былой вуліцы «Праўды»). На гэтай самай вуліцы ў будынку, дзе працавалі Шагал, Малевіч і іншыя цяпер вядомыя ўсім мастакі, ствараецца музей, пра які «Звязда» ўжо пісала. У гэтыя дні (да 7 ліпеня) праходзіць міжнародны пленэр, прысвечаны 25-й гадавіне шагалаўскага музея.

Ёсць упэўненасць, што ў горадзе стане традыцыйным і яшчэ адзін культурны праект — «ФотаКрок». Сёлета ўпершыню адбыўся міжнародны фестываль фатографаў імя Зыгмунта Юркоўскага. Ён сканструяваў шторна-шчылінны затвор для фотаапарата. Яго прозвішча ведаюць усе, хто захапляецца фотамастацтвам. І, на жаль, пакуль што мала хто ведае, што гэты легендарны канструктар жыў у Віцебску. Тут у яго была майстэрня. Яго здымкі даюць нам уяўленне пра мінулае горада. Падчас фэсту адбыліся майстар-класы, адкрыліся выстаўкі. І адна з іх — на чыгуначным вакзале. Такім чынам, Віцебск, як цяпер модна казаць, у трэндзе еўрапейскіх традыцый. На вакзалах у краінах ЕС розныя выстаўкі даўно сталі часткай інтэр'ера.

РЭТРААЎТО І КОНКУРС КАЛЯСАК

На галоўнай плошчы — Перамогі — адбыўся Дзень моладзі. Свае захапленні паказалі прадстаўнікі субкультур. Цікавым стаў арт-пікнік для мастакоў-пачаткоўцаў. Прыемна, што адбылася і акцыя «Размаўляй па-беларуску».

На плошчы вызначылі самага высокага і моцнага гараджаніна.

Шмат публікі сабраў парад рэтрааўтамабіляў. Уладальнікі ўнікальных «колаў» расказвалі пра гісторыю стварэння, куплі машын, паказвалі клас ваджэння.

Цікавым стаў і конкурс самых крэатыўных дзіцячых калясак.

У гарадскім парку адпачынку адбылася навамодная «фішка» — «Свята ветру». Арганізатары пастараліся, каб кожны правёў там час з карысцю. Правялі конкурс паветраных змеяў. Можна было навучыцца рабіць іх, правільна запускаць. Ёгі прачыталі невялічкую лекцыю. Парады наконт здаровага ладу жыцця давалі розныя эксперты. І яшчэ адна прыкмета часу — на святе можна было бясплатна (!) забраць рэчы, у якіх больш не маюць патрэбы былыя гаспадары.

Традыцыйнае ў Індыі свята фарбаў Холі ўпэўнена ўвайшло ў моду і ў нас. Сёлета сотні гараджан пажадалі пакідацца парашком з фарбай, сфатаграфавацца на памяць у адзенні, якое ў выніку «феерычнага вар'яцтва» стала каляровым. Цікава, што забава папулярная не толькі ў моладзі.

Гараджан вучылі рабіць аздараўляльны напой скрыпеню.

З ПОЛЬШЧЫ... ПА КАХАННЕ

На святе горада было шмат прыезджых. І не толькі з Беларусі.

Прыгожая дзяўчына Ганна прыехала з польскага горада Лодзь. З ёй пазнаёміліся на першым гарадскім вегетарыянскім святе. Яно адбылося ў комплексе «Залатое кола горада Віцебска «Дзвіна». Спадарыня Вжэсінска распавяла, што цікавіцца традыцыямі славян, радавымі ведычнымі практыкамі. Прыехала, каб пажыць у паселішчы радавых маёнткаў «Звон-гара». Адзначыла, што такіх у яе краіне няма. Дзяўчына хоча жыць на прыродзе, весці натуральную гаспадарку, вырошчваць экалагічна чыстую прадукцыю, займацца рамёствамі. Марыць сустрэць у Беларусі хлопца, які стане яе каханнем і пабудуе дом. Нядаўна брала ўдзел у «злёце палавінак» (праводзіцца ў паселішчы). Там ёсць шанц сустрэць свой лёс. Полька цудоўна ведае рускую мову, якую любіць з дзяцінства. А яшчэ яна — інструктар па гімнастыцы.

Госць з Масквы Уладзімір Горбань — чалавек з «залатымі рукамі»: на фестывалі «Таямніцы майстэрства» прадставіў дзергуноў — традыцыйную рускую цацку, часткі якой кіруюцца ніткамі. Запэўніў, што менавіта з такімі гулялі нашы продкі ў дзяцінстве. Цацкі маюць воданепранікальныя і антысептычныя ўласцівасці, таму іх можна купляць нават для немаўлят. Майстар робіць і іншыя драўляныя цацкі. У Віцебску пабываў ўпершыню. Тут яму вельмі спадабалася, збіраецца прыехаць на міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар».

Таццяна Кавалевіч, дырэктар Цэнтра дзелавога развіцця, падкрэсліла, што фестываль-кірмаш «Таямніцы майстэрства» — сацыяльны праект. Мінчанка канстатавала, што падтрымка рамеснікаў — вельмі карысная справа для дзяржавы, бо спрыяе, каб больш аматараў зараблялі на тым, што раней для іх было хобі. Людзі самі себе ствараюць працоўныя месцы, адкрываюць уласны бізнес. Рамёствы — гэта і імідж краіны, адна з «фішак», якія прывабліваюць замежных турыстаў. Апошніх у Віцебску з кожным годам усё больш.

Па традыцыі свята горада — «генеральная рэпетыцыя» «Славянскага базару». І можна канстатаваць, што яе правялі на 10 балаў!

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

Індыйскае свята фарбаў усё больш моднае ў Беларусі.

Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

АХ, ГЭТАЕ ВЯСЕЛЛЕ...

Не толькі спявала і танцавала!

На ўнікальным вясельным фестывалі, які адбыўся ў Віцебскім раёне, пабывалі карэспандэнты «Звязды». Увогуле журналістаў цяжка чымсьці здзівіць, але арганізатарам гэта ўдалося.

Фестываль стаў рэспубліканскім дзякуючы запрошаным з розных абласцей краіны майстрам забаўляльных шоу. Карэспандэнты ўбачылі самы вялікі вясельны картэж, паспыталі каравай-рэкардсмен, паспрабавалі пацалаваць... нявесту на хадулях.

Былі і іншыя сюрпрызы. Вядома, на вяселлях у якасці госця ўсе бывалі. Большасць чытачоў ведаюць, што адбываецца на вясельным святкаванні. Пасля ЗАГСа — у рэстаран. І пачынаецца застольны марафон. Бывае, цягнецца ён некалькі дзён. Першы тост — за наваспечаных мужа і жонку і гэтак далей. У перапынках — танцы. Калі вядучы свята вопытны, перыядычна будзе весела: абрады, конкурсы розныя...

А на «Вясельным фестывалі ў Віцебску» гледачы пераканаліся, што ў фантазіі вясельнай мяжы няма. І ў час інтэрнэту можна зрабіць вяселле насамрэч запамінальнай падзеяй (зразумела, былі б толькі грошы).

Месца правядзення фэсту выбрана не выпадкова. Менавіта ў прыгарадзе Віцебска па дарозе на аэрапорт ёсць так званае «Воранаўскае кольца» (першае слова ад назвы населенага пункта). Там, на скрыжаванні дарог, часта можна ўбачыць вясельныя картэжы. Але ж як такі...

Фестываль здзівіў: вялікай колькасцю BMW X5. І ўсе, між іншым, чорнага колеру. Каля 15 шыкоўных і стыльных аўто стартавалі з цэнтра горада. Адразу столькі чорных «бумераў» у калоне — такога ў Віцебску яшчэ не было. Многія гледачы флэш-моба паспявалі фатаграфавацца з тратуара... Напэўна, арыгінальнасць ідэі і ў тым, што кіроўцаў гэтых BMW да фестывалю літаральна шукалі на дарогах — прапаноўвалі прыняць удзел у незвычайнай падзеі.

Падчас вясельнага дэфіле гучалі апладысменты ў адрас мадэльераў і тых, хто паказаў іх творы. Фатографы, як каршуны, у гэты час стараліся заняць выгадныя месцы, каб зрабіць найлепшы кадр.

Бармены з RestoFamily частавалі напоямі, а «на закуску», акрамя іншага, можна было пакаштаваць гіганцкі каравай. Яго вага — аж 25 кілаграмаў. Ён быў зроблены па спецыяльным заказе майстрам 4 разраду ААТ «Віцебскхлебпрам» Наталляй Сычовай. У караваі былі 5 відаў салодкай начынкі. Арганізатары прызналіся, што праз вялікі памер — 1,5 на 1,5 метра — каравай прыйшлося дастаўляць у спецыяльным грузавіку.

Не абышлося на фестывалі і без рэгістрацыі шлюбу. Ролю жаніха і нявесты выканалі машыніст цеплавоза Ігар і былая мадэль Насця. Глядзеліся яны, дарэчы, вельмі гарманічна. А вось прадстаўніца ЗАГСа была сапраўднай. Вядома, што сёння шлюб можна зарэгістраваць дзе заўгодна. Хоць у кавярні ці на ферме... Ці, напрыклад, у аэрапорце па суседстве з фэстам. Ды і, калі ўжо так хочацца, на борце самалёта. Беларускія ЗАГСы на ўсё пойдуць, каб толькі было больш шчаслівых сем'яў. (Толькі летась у краіне зарэгістравалі больш за 82 тысячы шлюбаў.)

Дарэчы, сярод гасцей былі і будучыя жаніхі, нявесты, іх сваякі. Яны маглі ў адным месцы да ўсяго адразу прыгледзецца. Атрымалі кансультацыі наконт таго, якія ў модзе дэкоры, як лепш арганізаваць банкет. Змаглі дамовіцца з вядучымі вясельляў, фларыстамі і фатографамі...

Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

Кіраўнік дырэкцыі фестывалю Вольга Бабкова прызналася, што «жыве вяселлямі». У яе ёсць нават... пастаянныя кліенты. Адна з іх выходзіла замуж аж 3 разы. І нікому, акрамя Вольгі, не давярала правесці чарговае асабістае свята.

У тых, хто звязаны з вясельным бізнесам, можна сказаць, «жніво». Лета — той самы сезон, калі працаваць прыходзіцца да сёмага поту, з раніцы да ночы. Але так хочацца, каб вяселле было адзіным у жыцці...

Аляксандр ПУКШАНСКІ. *pukshanski@zviazda.by*
Віцебскі раён.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

Пры пашкоджанні хваробамі і шкоднікамі, а таксама пры перасадцы, абразанні і летняй засусе туя адчувае стрэс.

ЧАМУ ЖОЎКНУЦЬ ТУІ?

Кожная шыпулька туі жыве прыкладна ад 3 да 6 гадоў, потым восенню яна жоўкне і адмірае, а на яе месцы вырастае новая. Гэта натуральны працэс, таму турбавацца няма пра што. Трэба проста акуратна выдаліць з расліны пажоўклую і высахшую ігліцу.

Яшчэ адна натуральная прычына змены афарбоўкі ігліцы (звычайна яна становіцца бурай) — ахоўная рэакцыя расліны на паніжэнне тэмпературы паветра ў канцы восені. З надыходам зімы ігліца ў заходняй туі становіцца бронзавай, а вясной яна зноў зелянее.

Аднак хвойная расліна можа раптам пажоўкнуць і высахнуць па іншых прычынах, праз якія туя рызыкуе загінуць.

Няправільны догляд

Калі туя жоўкне вясной ці летам — гэта не натуральны працэс. Хутчэй за ўсё, расліне не падабаюцца ўмовы росту. У такой сітуацыі ў першую чаргу неабходна звярнуць увагу на састаў глебы.

Для вырошчвання туй не падыходзяць пяскаваныя і гліністыя глебы з застоем вільгаці, бо ў гэтых умовах каранёвая сістэма расліны можа загніць. Ідэальны глебагрунт — дзярновая зямля з дабаўленнем торфу і рачнога пяску. А яшчэ абавязковы добры дрэнаж.

Калі туя расце на збедненай глебе, неабходна ўносіць спецыяльныя ўгнаенні для хвойных раслін. Часцей за ўсё ігліца жоўкне (а часам нават бялее) пры недахопе жалеза, а пры дэфіцыце фосфару яна можа стаць чырванавата-фіялетавай.

Пры неналежным доглядзе туя можа яшчэ і пачарнець. Часцей за ўсё гэта адбываецца, калі сабакі пакідаюць на ёй пазнакі мачой. Пастарайцеся ізаляваць хвойныя расліны ад свойскіх жывёл.

Хваробы

Маладыя туі пасля сходу снегу можа пашкодзіць бурая снежная цвіль (гэтая хвароба хвойных называецца шутэ). Ігліца становіцца карычневай, пакрываецца шэра-чорным налётам і паступова адмірае. Каб гэтага пазбегнуць, вясной раз на месяц неабходна апырскваць хвойныя дрэвы фітаспарынам.

Розныя грыбковыя хваробы могуць пашкодзіць не толькі ігліцу, але і іншыя часткі расліны — ствол і карані. Хуткае распаўсюджванне хваробы назіраецца пры вырошчванні туі на гліністых і дрэнна дрэніраваных глебах. Таму трэба не дапускаць застою вільгаці і для прафілактыкі вясной і восенню апырскваць расліны фунгіцыдам. Пры моцным заражэнні дапускаецца праводзіць апрацоўкі і летам.

Шкоднікі

Калі ігліца набыла руда-карычневае адценне і пакрылася шэрым налётам, верагодна, на ёй пасяліліся сысучыя насякомыя: туевая тля, клоп, туевая лжэшчытоўка, ядлоўцавая шчытоўка, мучніста чарвец. Гэтыя шкоднікі высмоктваюць з раслін пажыўныя сокі.

Каб знішчыць насякомых, на пачатку вясны хвойныя расліны варта апырскаць карбофосам, а на працягу лета правесці прафілактычныя апрацоўкі актэлікам або рагорам.

Таксама небяспечныя лічынкі шэрай лісцяной лісцявёрткі (яны плятуць на шыпульках коканы, у выніку чаго парасткі жоўкнуць), вусені аўсянікападобнай мяшочніцы (ядуць галінкі туі), жукі-даўганосікі (аб'ядаюць ігліцу і кару маладых раслін).

А калі вы выявіце пад карой дрэва, якая добра аддзяляецца, хады і адтуліны, значыць, на ім пасяліліся ствалавыя шкоднікі, з якіх самы распаўсюджаны — туевы лубаед. Каб пазбавіцца ад гэтых насякомых, трэба ў маі-чэрвені апрацаваць расліны фуфанонам або актэлікам.

Улічыце: *Каб дапамагчы раслінам справіцца з неспрыяльнымі фактарамі, апырскайце іх любым антыстрэсавым прэпаратам (напрыклад, цырконіем або НВ-101).*

Даты Падзеі Людзі

29 ЧЭРВЕНЯ

1861 год — 155 гадоў таму нарадзіўся Сямён Давыдавіч Камінскі, беларускі вучоны ў галіне афтальмалогіі, прафесар. З 1889 года жыў і працаваў у Мінску, з 1890-га — член Таварыства мінскіх урачоў. У 1920 годзе быў народным камісарам аховы здароўя Беларусі. Удзельнічаў у стварэнні вышэйшай медыцынскай школы ў Беларусі. Аўтар падручнікаў па хваробах вачэй. Навуковыя працы па вывучэнні трахомы і вочнага траўматызму. Памёр у 1939 годзе.

1906 год — 110 гадоў таму нарадзіўся Іван Данілавіч Чарняхоўскі, савецкі военачальнік, двойчы Герой Савецкага Саюза (1943 г., 1944 г.), генерал арміі. У гады Вялікай Айчыннай вайны камандаваў танкавай дывізіяй, танкавым корпусам, арміяй; камандуючы войскамі Заходняга, а затым 3-га Беларускага франтоў. Войскі 3-га Беларускага фронту разам з 1-м Прыбалтыйскім фронтам ажыццявілі Віцебска-Аршанскую аперацыю (1944 г.), а з 1-м і 2-м Беларускімі франтамі — Мінскую аперацыю (1944 г.), стварылі мінскі «кацёл», вызвалілі Віцебск, Оршу, Барысаў, Мінск, Вільнюс і іншыя населеныя пункты. Смяротна паранены ў ходзе Усходне-Прускай аперацыі 18 лютага 1945 года. Каля вёскі Рэдзькі Дубровенскага раёна на месцы каманднага пункта І.Д. Чарняхоўскага ўстаноўлена мемарыяльная пліта, у вёсцы Сцешыцы Вілейскага раёна — яго бюст.

1957 год — на нечарговым Пленуме ЦК КПСС прынята пастанова «Аб антыпартыйнай групе Малянкова, Молатава, Кагановіча і Шапілава, які далучыўся да іх». Да чэрвеня 1957-га абвастрылася барацьба паміж Першым сакратаром ЦК Хрушчовым і яго калегамі па вышэйшым партыйна-дзяржаўным кіраўніцтве СССР, на чале з Георгіем Малянковым, Вячаславам Молатавым і Лазарам Кагановічам. Апошнія выступалі як супраць рэзкага выкрыцця культу асобы Сталіна і яго трагічных наступстваў для краіны, так і супраць хрушчоўскай авантурыстычнай эканамічнай палітыкі. Молатаў, Малянкоў і Кагановіч, падтрыманыя сваімі аднадумцамі са «старой сталінскай гвардыі», а таксама больш маладым сакратаром ЦК Дзмітрыем Шапілавым (які лічыўся хрушчоўскім вылучэнцам) склалі большасць у Прэзідыуме ЦК і правялі рашэнне аб зняцці Хрушчова з яго пасады. Першы сакратар дамогся тэрміновага склікання пазачарговага Пленума ЦК, які сабраўся 22 чэрвеня 1957 года. На першым жа пасяджэнні міністр абароны СССР маршал Георгій Жукаў рэзка асудзіў праціўнікаў Хрушчова, абвінаваціўшы іх у многіх злачынствах, учыненых у гады кіравання Сталіна. Такім чынам, яму ўдалося схіліць на бок Хрушчова большасць членаў ЦК. У выніку на заключным пасяджэнні Пленума 29 чэрвеня 1957 года была прынята Пастанова «Аб антыпартыйнай групе Малянкова, Молатава, Кагановіча і Шапілава, які далучыўся да іх». У ёй дзейнасць гэтых партыйных кіраўнікоў кваліфікавалася як «несумяшчальная» з ленінскімі партыйнымі прынцыпамі, яны былі выведзены са складу членаў Прэзідыума ЦК і са складу ЦК і пазбаўлены тым самым усякага ўплыву ў партыі і дзяржаве.

Было сказана

Алесь ЗВОНАК, паэт:
«Адна быць можа роднай маці ў сына,
Як мова роднай можа быць адна».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	4.41	21.45	17.04
Віцебск	4.22	21.43	17.21
Магілёў	4.31	21.35	17.04
Гомель	4.37	21.22	16.45
Гродна	4.58	21.58	17.00
Брэст	5.08	21.50	16.42

Месяц

Апошняя квадра 27.06—03.07. Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Міхаіла, Пятра, Ціхана.*
К. *Саламеі, Францішка.*

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+29..+31°С	КІЕЎ	+26..+28°С	РЫГА	+24..+26°С
ВІЛЬНЮС	+28..+30°С	МАСКВА	+24..+26°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+22..+24°С

УСМІХНЕМСЯ

— І што ж мы будзем рабіць у сітуацыі, якая склалася?

— Купляем каньяк. Далей імправізуем.

Тры правілы клуба аматараў есці маліны проста з куста.

1. Ніколі не разглядайце толькі што сарваную маліну, адразу ешце яе.

2. Калі нешта ў роце пачало варушыцца, падкіньце яшчэ некалькі малін і пражуйце.

3. Калі гэтае нешта не жуецца або супраціўляецца, лепш выплюньце/выпусціце яго.

— Ты не ведаеш, як трусоў разводзіць?

— Проста не перашкаджаць ім, яны самі ўсё зробяць.

Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснікі галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.023. Індэкс 63850. Зак. № 2466.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 28 чэрвеня 2016 года.